PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 39 (2472) Год XLVIII | Беласток, 28 верасня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Пра канікулы і не толькі

Міхась Куптэль

Востраў Борнхальм — рай веласіпедыстам. А ці такім раем не маглі б быць падляшскія раўніны? Што так можа быць, пераканаўся я сёлета, аб'ехаўшы на веласіпедзе бадай усе мясцовасці ў радыусе дзесяці кіламетраў ад Махнатага; заахвоціў мяне да гэтага жыхар Гдыні А. Ельміновіч, які штогод праводзіць водпуск у Орлі.

Глядзеў я на наваколле не толькі вачыма турыста-веласіпедыста, але і беларуса, выхадца з роднай зямлі, лёс якой не перастаў быць мне абыякавым. І сваімі ўражаннямі хачу падзяліцца ў першую чаргу з чытачамі „Нівы", але не толькі. Можа зацікавяцца гэтай інфармацыяй кіраўніцтвы гмін, мо ў будучыні турысты-веласіпедысты з глыбі Польшчы, а мо і з Еўропы. Так-так, не здзіўляйцеся такім сцвярджэнням, прачытайце як нямецкія турысты плылі рэчкай Нараўкай („Osobliwe atrakcje Dzikiego Wschodu", „Polityka" № 34 ад 23 жніўня г.г.) Яны праз мабільны тэлефон расказвалі дзедкам у Брэмене як дояць кароў, пякуць хлеб, б'юць масла ў пральцы „Франя" і захоўваюць яго ў лісцях хрэну, як кормяць курэй, а пасля заахвочвалі іх наведаць гэтыя мясцовасці.

Што трэба, каб пераборлівы турыст заглянуў у наш куток? Перш за ўсё трэба яму падсунуць пад вочы інфармацыю; не абы-якую, але такую, якая яго зацікавіць.

Я, калі ездзіў на веласіпедзе па Гайнаўшчыне, ведаў больш-менш, дзе тыя цікавыя месцы, краявіды і людзі, але нідзе не напаткаў інфармацыі, якая б зацікавіла турыстаў, заахвоціла затрымацца ў Гайнаўцы, у той „браме ў пушчу", пра што так мараць гайнаўскія чыноўнікі, разводзячы рукі, што ў горадзе вялікае беспрацоўе. Інакш у Белавежы, там не толькі ёсць гатэлі і турыстычныя кватэры, але і інфармацыя пра іх пры ўездзе ў мястэчка. Гайнаўка мае што паказаць і чым зацікавіць, але нічым не заахвочвае турыста затрымацца і паглядзець слаўны, але закрыты на чатыры затворы сабор, ці Беларускі музей, ці старую хімічную фабрыку, ці былы тартак. У той „браме ў пушчу" не мог я ў нядзелю набыць маю ўлюбёную „Ніву", бо ўсе кіёскі зачынены, а калі мае сябры з Гдыні спыталі, дзе там можна смачна і нядорага пад'есці, я проста развёў рукі ад бязраднасці.

Дзе, апрача „Нівы" („Помнікі мінуўшчыны ў Арлянскай гміне" Міхала Мінцэвіча ад 26 студзеня г.г.), можна даведацца пра мінуўшчыну Арлянскай гміны? У якіх даведніках? Быў я ў Орлі сёлета ў ліпені. Драўляная царква з 1796 года закрыта, не згадваючы пра мура-

[працяг ☞ 4]

Фота Міраслава Гуцкіна

На базары па Юравецкай у Беластоку

Развітанне з Юравецкай?

Мацей Халадоўскі

— Што гэта будзе, не ведаю. Мабыць, не прыеду, а прынамсі не буду прыязджаць так часта, як раней. Шматразовая віза за 50 еўра гэта для мяне маёнтак! Ну, а будуць пры выдаванні віз яшчэ іншыя абвастрэнні, — кажа Эдзік, які гандлюе на базары па беластоцкай вул. Юравецкай.

Дваццаціпаругадовага Эдзіка можна было сустрэць больш-менш ад года ля стаянкі таксі за мастком праз рэчку Белую, па-за межамі стадыёна Ягелоніі. Гандляваў чым удалося, галоўным чынам цыгарэтамі і алкаголем. Кантрабанду перавозіў толькі сабе вядомымі спосабамі, як і ўся група з больш за дзесяці асоб беларусаў, якую пастаянна бачылася ў гэтым месцы. Большасць з іх, як і Эдзік, родам з Гродна або яго ваколіцы. Іншыя гандлявалі ўсякай драбязой — ад згушчанага малака па адзенне. Так было і на базары „Мадро" каля чыгуначнага вакзала, і на вялікім базары па вуліцы Кавалерыйскай. Фарбаваная бландзінка за сорак, Света, заўсёды элегантна апранутая, прадавала на Юравецкай усё, „што сходзіла".

— Я прыязджала ў Беласток прынцыпова тры разы ў месяц, найчасцей на пяць дзён. Выязджала ў пятніцу па тавар, вярталася ў панядзелак зранку. Было выгадна, наймала пакой у палякаў за 200 злотых у месяц. Было выгадна нават тады, калі адзін з гаспадароў падкрадаў у мяне цыгарэты, якія я прывозіла прадаваць. Цяпер я задумваюся, ці ўвогуле прыязджаць.

З 1 кастрычніка перасякаць польска-беларускую мяжу трэба будзе з візай — шматразовай (на год) за 50 еўра альбо аднаразовай за 10 еўра (амаль столькі ж, што і ўспамога беспрацоўнаму). Шматразовая віза гэта больш-менш палова сярэдняй зарплаты ў Беларусі, пры значна большай пакупной здольнасці долара. Света прызнаецца, што за адзін прыезд на Юравецкую ўдавалася ёй зарабіць 400-500 злотых, значыць, каля 100-125 долараў.

— Агулам, трэба каб вярнуўся мне куплены тавар, падарожжа, расходы на кватэру, расходы ў Беластоку (напрыклад, праезды аўтобусамі). Не ўспомню аб тым, што на мяжы таксама даводзіцца часамі камусьці нешта „даць". Ну, а я ж прыязджаю зарабіць на жыццё, — расказвае Света. — Гэта, праўду вам скажу, адзіная мая крыніца ўтрымання. Жыву з маці з яе пенсіі. А так проста — не ўдаецца выжыць.

У сувязі з увядзеннем новых візавых правіл, беларусы на Юравецкай баяцца і іншых абвастрэнняў.

— Пэўна, завядуць у консульствах картатэкі і будуць правяраць, чым мы тут займаемся, калі прыязджаем так часта. Будуць пытацца, з якой мэтай прыязджаем, патрабаваць пацвярджэння, што ёсць у нас грошы на ўтрыманне ў час пабыўкі. А як жа ж мне даказаць, што я так часта прыязджаю сюды на адпачынак, ці па іншай, так сказаць, турыстычнай, прычыне, ды яшчэ ёсць у мяне на гэта грошы, — задумоўваецца Эдзік.

Эдмунд Бурэль, якога выпадкова я сустрэў на базары па Юравецкай, да нядаўна прэс-інфарматар клуба „Ягелонія", лічыць, што абмежаванне прыездаў беларусаў адмоўна адаб'ецца на становішчы клуба, каманда якога цяпер лідэрам у спаборніцтвах другой футбольнай лігі Польшчы.

— Значную частку прыбытку клуб меў з аплат за гандлёвыя месцы на тэ-

[працяг ☞ 2]

Не паразумеліся ☞ 3

Міністры замежных спраў Нямеччыны Ёшка Фішар і Польшчы Владзімеж Цімашэвіч гаварылі перад усім аб праекце новай еўрапейскай канстытуцыі. Польскі ўрад не згаджаецца на змену спосабу галасавання ў Радзе Еўропы, якая абмяжуе значэнне Польшчы і краін з меншай колькасцю насельніцтва, а выдатна ўзмоцніць буйныя дзяржавы.

Шведы ў гісторыі беларусаў ☞ 4

Скандынаўскі перыяд у гісторыі Беларусі пачаўся ў 862 г. разам з прыходам шведскіх плямёнаў русаў, якімі камандаваў конунг Рурык (Rorik). Сталіцай свае імперыі ўчыніў Ноўгарад (Holmgard). Уладанне над Полацкам перадаў ён аднаму са сваіх князёў. У 980 г. у гэтым горадзе княжыў Rangvald, вядомы як Рагвалод.

На радзіме Уладзіслава Сыракомлі ☞ 5

29 верасня г.г. у Смольгаве ўрачыста адзначаць 180 гадавіну з дня нараджэння Уладзіслава Сыракомлі. Прыедуць даследчыкі і літаратары з Мінска (ды не толькі), будуць даклады і чытанні, знаёмства з месцамі паэта і наваколлем. З гэтай нагоды ў школе адкрыюць новы музей і камень з табліцай у гонар патрона і слаўнага ўраджэнца.

Нацыянальная разнароднасць „Ператоча" ☞ 8

У час Мастацкіх інтэграцыйных сустрэч „Ператоча" прэзентавалася беларуская, польская, украінская, яўрэйская, нямецкая і ромская культура. „Ператоча" — гэта месца перад токам у гумне, на якім адбывалася цяжкая праца — малацьба. Арганізаваліся на ім таксама вяселлі і вясковыя забавы. З'яўляецца яно сімвалам багацця культуры і адкрытасці.

Лаўрэаты — ужо вядомыя ☞ 8

На VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы сёлета паступіла 39 прац, у тым ліку 18 у групе дзяцей і моладзі пачатковых школ і гімназій ды 21 — у групе моладзі сярэдніх школ і дарослых. Сярод аўтараў дасланых прац упершыню ў конкурсе прынялі ўдзел 14 дэбютантаў.

У Краіне шчаслівасці ☞ 11

Славамір Галёнка нядаўна купіў участак зямлі сярод пушчанскіх дрэў і пачаў будаваць у ім драўляны дом. Месца назваў „Краінай шчаслівасці — Слаўконіяй". Выкарыстоўваючы лясны ўчастак, хоча разгарнуць грамадскую дзейнасць. Плануе арганізаваць мастацкі пленэр з заняткамі для мясцовых дзяцей, фэст і канцэрты ў Нараўцы.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Мінюст пачаў працэс ліквідацыі „Вясны”

Вярхоўны суд распачаў справу па іску Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі грамадскага аб’яднання „Праваабарончы цэнтр «Вясна»”. Аб гэтым 13 верасня стала вядома сябрам арганізацыі. Іск быў падпісаны асабіста міністрам юстыцыі Віктарам Галаванавым яшчэ 2 верасня.

Падставамі для ліквідацыі аб’яднання чыноўнікі палічылі парушэнні правілаў вядзення справаводства; нявыплату сябрамі арганізацыі, насуперак патрабаванням Статута, сяброўскіх складчын; вылучэнне назіральнікаў падчас выбарчай кампаніі 2001 года, парушэнні пры стварэнні рэгіянальных аддзяленняў і інш. Сярод абвінавачанняў вылучаецца тое, якое тычыцца ўдзелу аб’яднання ў судовых працэсах па абароне грамадзянаў, якія не з’яўляюцца сябрамі „Вясны”. На думку Міністэрства юстыцыі, нават рэгістрацыя „Вясны” ў 1999 годзе, якую праводзіў Мінюст, адбывалася з парушэннямі — на думку чыноўнікаў, на той час колькасць заснавальнікаў „не дацягвала” да той, якая патрэбная пры рэгістрацыі аб’яднання рэспубліканскага ўзроўню.

Кіраўнік Сістэмы калектыўнай абароны Асамблеі НДА Беларусі Юры Чавусаў лічыць, што „частка з гэтых прэтэнзіяў грунтуецца на матэрыялах шматлікіх праверак, што праводзіліся апошнім часам у «Вясне» і яе рэгіянальных аддзяленнях, а частка прадстаўляе сабою плод руплівага шматгадовага назапашвання «кампрамату» на праваабаронцаў. Хутчэй за ўсё, Мінюст проста выканаў замову, якая сыходзіла з іншых стурктураў”.

На думку юрыста, падача органамі юстыцыі іску аб ліквідацыі — „найбольш жорсткі сродак уціску на няўрадавыя арганізацыі. Сам факт падачы такога іску ставіць на аб’яднанні крыж — суды ніколі не ідуць супраць сваіх калегаў з Мінюста”. На сённяшні дзень вядома, што 23 верасня ў 10 гадзін раніцы ў Вярхоўным судзе адбудзецца сумоўе ісца і адказчыка з суддзёй. У выніку гэтай размовы будзе вызначана дата першага судовага пасяджэння па справе аб ліквідацыі грамадскага аб’яднання „Праваабарончы цэнтр «Вясна»”.

(www.belngo.info, 15.09.2003)

Мікола Маркевіч узначаліў ТБМ у Гродне

У Гродне адбылася справаздачна-выбарчая канферэнцыя гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Новым старшынём абралі Міколу Маркевіча, які рэдагаваў газету „Пагоня”, якую ліквідаваў Вышэйшы гаспадарчы суд амаль два гады таму.

Дагэтуль менш за тры адсоткі гродзенскіх школьнікаў навучаліся на беларускай мове. Цяпер і гэтая лічба зменшылася. Мікола Маркевіч спадзяецца нейкім чынам нейтралізаваць русіфікацыю ў школах.

Пасля закрыцця гродзенскай газеты „Пагоня” суд пакараў за паклёп на прэзідэнта РБ Міколу Маркевіча і журналіста Паўла Мажэйку. Павал узначальвае цяпер гродзенскую арганізацыю Беларускай асацыяцыі журналістаў. Сёння трывае праверка філіі БАЖ. Яе праводзіць юрыдычная служба гарвыканкама на замову Абласнога ўпраўлення юстыцыі. Паводле Мажэйкі, вынікі стануць вядомыя на наступным тыдні.

Хартыя ’97, 15.09.2003 г.

Развітанне з Юравецкай?

[1 ☞ працяг]

рыторыі стадыёна. Большасць гандлюючых тут да гэтага часу — беларусы.

— На Юравецкай заўсёды можна было ў беларусаў штосьці купіць, хоць бы таннейшую вопратку. Для мяне гэта была ідэальная сітуацыя. На пакупкі ў крамах у мяне грошай няма, — непакоіцца пажылая беластачанка, якую я сустрэў ля аднае крамкі на Юравецкай.

Аднаго вераснёвага поўдня ля Юравецкай паліцыйны патруль патрабаваў прад’явіць дакументы ў дзвюх беларусак, якія сядзелі на лавачцы ля базарнай стаянкі таксі. Раней пачулася:

— Uwaga, idą!

У жанчын тавару не было. Аднак, іх даныя былі спісаны. Пасля адна з іх расказвала:

— Гэта яшчэ нічога. Спісалі, дык спісалі. Цяпер, вось, пачнуцца клопаты, пасля ўвядзення віз! Мы павысім цэны, вам таксама не будзе выгады. Нам нічога не ўдасца прадаць. Ну, дык чаго тады прыязджаць.

Прадстаўнікі міністэрстваў замежных спраў, якія 26 жніўня ў Мінску падпісалі дамову аб узаемным памежным руху, адзначылі:

— Польска-беларуская мяжа павінна застацца добрасуседскай, прыязнай мяжой партнёрскага супрацоўніцтва.

На інтэрнэт-старонках польскага МЗС можна прачытаць выказванні наконт увядзення віз:

— Ужо не памятаем, як мы ездзілі *на саксы* ў Нямеччыну. Там рабілі сваё сённяшнія бізнесоўцы.

Паводле ацэнак ведамства замежных спраў у Варшаве, у консульствах у Беларусі (Мінск, Брэст, Гродна) будзе выдавацца каля 280 тысяч віз у год. На працягу трох першых дзён верасня выдадзеных было роўна 497. Бясплатныя візы атрымаюць асобы, якія наведваюць магілы блізкіх, а з 50-працэнтнай скідкай тыя, хто наведвае сваякоў (бацьку, маці, мужа, дзіця, дзядоў...). У гэтым апошнім выпадку трэба ў консульстве скласці адпаведнае пасведчанне, выдадзенае пашпартным сталом. Прытым, у абодвух выпадках можна гэтак зрабіць толькі два разы ў год.

Мацей Халадоўскі

Ідэалагізацыя Беларусі, як ідалаізацыя прэзідэнта

Праца па ўкараненні ў Беларусі „дзяржаўнай ідэалогіі” набірае ўсё большыя абароты. У недалёкім будучым у звычайнага грамадзяніна не застанецца таго месца, дзе б пра ідэалогію не было чутно ані слова. У пачатку верасня ў грамадскім жыцці краіны адбыліся даволі цікавыя падзеі, якія, на першы погляд, не такія ўжо і значныя. Але, аналізуючы магчымае развіццё сітуацыі, прыходзіш да высновы, што насаджаць так званую дзяржаўную ідэалогію лукашэнкаўскае кіраўніцтва ўзялося з вялікім імпэтам.

Пачатак новага навучальнага года праходзіў пад знакам увядзення ў сістэму адукацыі новага прадмета: „Асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы”. Нягледзячы на тое, што падручнікі па гэтай цікавай дысцыпліне яшчэ не выйшлі з друкарняў, студэнтам у вышэйшых навучальных установах трэба здаць экзамен па ёй у канцы семестра. Па вялікім рахунку, гэта не так страшна, калі зважаць на жарт, што студэнт за адну ноч можа кітайскую грамату адолець. Іншая справа, наколькі замацуецца ў свядомасці навучэнца тое, аб чым вучыць новаспечаная ідэалогія.

Аналагічныя працэсы адбываюцца і ў сярэдняй школе. Так, напрыклад, па меркаванні беларускага прэзідэнта менавіта школа павінна стаць цэнтрам ідэалогіі на сяле. Самае горшае, што тлумачыць дзецям мала каму зразумелыя дэфініцыі дэмагагічнага вінегрэту з камуністычнай, ліберальнай і кансерватыўнай ідэалогій трэба менавіта тым, хто па словах класіка „сеюць разумнае, добрае, вечнае”. Бо ўся праца іх звядзецца да прапаганды адарванай ад усялякага навуковага абгрунтавання „праўды” прэзідэнта, які з’яўляецца „гарантам фармавання і рэалізацыі ідэалагічнай палітыкі дзяржавы”. Разабрацца ў неадпаведнасці таго, што кажуць настаўнікі сапраўдным жыццёвым рэаліям, зважаючы на эканамічныя „дасягненні” Беларусі і яе ўрада, будзе няцяжка нават не надта пытліваму розумам юнаку. За прыкладам ісці далёка не трэба — апошняе дзесяцігоддзе існавання СССР.

На прадпрыемствах усіх форм уласнасці, на якіх больш за 300 чалавек, у хуткім часе мусяць з’явіцца „намеснікі кіраўніка па ідэалагічнай працы”. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўключыла гэтую пасаду ў адпаведны даведнік „Пасады служачых усіх галін эканомікі”. Такі намеснік кіраўніка, зразумела, не будзе мець дачыненне ані да кіравання вытворчым працэсам, ані да выраблення чагосьці сваімі рукамі. Атрымліваць грошы гэты чалавек будзе толькі за тое, што расхвальвае палітыку цяперашняй улады, прычым за кошт тых, перад кім ён будзе гэта рабіць.

Не лягчэй беларускаму грамадзяніну становіцца і па-за сценамі вучэльняў і прадпрыемстваў. „Сродкі масавай інфармацыі сёння — гэта перш за ўсё інструмент правядзення ў жыццё дзяржаўнай ідэалогіі, і дзейнасць сваю яны павінны будаваць з улікам гэтай функцыі”, — кажа А. Лукашэнка. Зважаючы на гэта, інфармацыйная работа калектываў газет, часопісаў, радыё і тэлебачання мусіць пайсці кудысьці далёка-далёка, а галоўная мэта дзейнасці карэспандэнтаў, журналістаў, рэдактараў звядзецца да распаўсюду прапагандысцкіх шаблонаў у розных варыяцыях. Ці вялікай будзе цікавасць да такога выніку журналісцкай дзейнасці ў насельніцтва? Наўрад. Сведчаннем чаму — падзенне накладаў праўрадавых выданняў.

Сваю апантаную „ідэалагічную” дзейнасць лукашэнкаўская ўлада зараз абгрунтоўвае ўласнымі сацыялагічнымі апытаннямі, згодна якім амаль 80% насельніцтва лічыць патрэбнасць у краіне дзяржаўнай ідэалогіі і тым, што „спроба пабудовы грамадства ва ўмовах адсутнасці пэўнай ідэалогіі не апраўдалася”. З чаго паўстаюць пытанні. Па-першае, хто гэта ва ўладзе ўвогуле спрабаваў будаваць свядомае беларускае грамадства, гадамі займаючыся „будаўніцтвам Саюза Беларусі і Расіі”? І па-другое, што гэта за беларуская дзяржаўная ідэалогія, якая ў сваёй аснове грунтуецца больш на словах, дзеяннях і жаданнях аднаго чалавека, хай сабе і прэзідэнта, а не на шматвяковай культуры, мове і традыцыях, якімі вызначаецца беларускі народ?

З усяго вышэйсказанага прыходзіш да высновы, што новаспечаная „ідэалогія” дасягне ў чалавечай свядомасці такі ж эфект, як і колішняя камуністычная. І адбудзецца гэта значна хутчэй, бо там кіруючай і накіроўваючай была партыя. А гэта ўсё ж такі пэўная група, а не адзін кіруючы і накіроўваючы, як у Беларусі, чалавек.

Уладзімір Лапцэвіч

Супрацоўніцтва ў сферы бяспекі

9 верасня 2003 г. у Белавежы адбылася другая рабочая сустрэча дэлегацый Дзяржаўнага Сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь і Бюро Нацыянальнай Бяспекі Рэспублікі Польшча, якія ўзначальвалі сакратар СБ Генадзь Нявыглас і кіраўнік БНБ Марэк Сівец.

У ходзе сустрэчы былі абмеркаваны стан і перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы міжнароднай бяспекі, намечаны сумесныя крокі па далейшым развіцці ўзаемадзеянняў у дадзенай сферы. Бакі дамовіліся, што рабочыя кантакты будуць мець рэгулярны характар. Чарговую сустрэчу намечана правесці летам 2004 г. у Беларусі.

10 верасня дзяржаўны сакратар СБ РБ Генадзь Нявыглас сустрэўся з падляшскім ваяводам Маркам Стшалінскім і абмеркаваў пытанні паглыблення супрацоўніцтва бакоў на рэгіянальным узроўні, далейшага дасканалення сістэмы трансгранічнага руху, перспектывы развіцця інфраструктуры па абодвух баках граніцы.

(www.mfa.gov.by)

Аб гала-канцэрце конкурсу „Мальвы 2003”

13 верасня 2003 г. у Седльцах Мазавецкага ваяводства адбыўся гала-канцэрт Міжнароднага фестывалю „Мальвы 2003”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел маладыя выканаўцы з Польшчы, Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі, Расіі. Арганізатарамі фестывалю выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Польшча і рэгіянальныя ўлады горада Седльцы.

У склад журы фестывалю ўвайшоў народны артыст Беларусі, кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь Міхаіл Фінберг. Мерапрыемства наведалі намеснік міністра культуры Польшчы Рафал Скомпскі і пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка.

Па выніках конкурсу дыпламантам стаў малады ваканаўца з Беларусі Руслан Мусвідас.

(www.mfa.gov.pl, 15.09.2003)

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Сённяшнія ўлады Падляшша — ваявода Марэк Стшалінскі (першы злева) і маршалак Януш Кшыжэўскі (у цэнтры)

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Адам Сяменчык з гарадчанкамі

Святкаванне паміж

Хоць сярод некаторых гісторыкаў святкаванне 490-годдзя ўзнікнення Падляшскага ваяводства выклікае сумненні, то праводзіліся яны ў сталіцы рэгіёна з вялікай пампезнасцю і пад лозунгам „Krzepmy się!". Першае святкаванне дня нараджэння ваяводства, сарганізаванае маршалкоўскай і ваяводскай управамі ды Канфедэрацыяй дваровай шляхты мела быць у прынцыпе „прамацыйна-культурна-адукацыйным мерапрыемствам, накіраваным да жыхароў нашага шматкультурнага ваяводства і першым крокам да падрыхтоўкі 500-годдзя". Так прынамсі ў адзін голас паведамлялі прэс-інфарматаркі ваяводы і маршалка.

Да даты 29 верасня 1513 г. дакапаўся ў архівах гісторык Уладзімір Ярмолік і разам са сваім калегам па прафесіі Ежы Урвановічам яе распаўсюдзілі. У той якраз дзень русін Іван Сапега стаў падляшскім ваяводам. Аднак, як прызнаюцца ледзь не аднагалосна гісторыкі, тагачаснае Падляшша не мела нічога супольнага — перш за ўсё тэрытарыяльна — з сённяшнім. Да таго ў межах Польскай Кароны ў цэласці тэрыторыя ваяводства ўфармавалася толькі ў 1569 г. на Люблінскім сойме. Незалежна ад тых сумневаў цяперашнія адміністрацыйныя і самаўрадавыя ўлады ваяводства (здамінаваныя кіруючым таксама і краінай Саюзам левых дэмакратаў) рашылі святкаваць, каб — як гэта патлумачылі іх прадстаўнікі — „інтэграваць улады з людзьмі мастацтва і падляшскай грамадскасцю".

Niepospolite Artystów Poruszenie

Першы дзень святкавання праходзіў пад знакам духоўных уцех, ды не толькі. Шматлюдна сабраны пад ратушай натоўп мог пасля поўдня паслухаць музыку пад лозунгам „Закусі музычныя, інакш мастацкае асарці" ды „Музычны цымэсік". Ігранне, хоць і адпавядала ўрачыстасці, аднак, натоўпу не прывяло да ўздыму. У час аднаго з выступленняў намнога больш цікавасці выклікаў праезд па вуліцы пажарных машын на сігнале. Больш прыцягваў парад беластоцкіх тэатраў, якія ўехалі пад ратушу на аўтаперавозчыках-лафетах, у старадаўніх строях і з агромнымі лялькамі. Гэта было „Niepospolite Artystów Poruszenie". Тры лафеты, кожны ў сваю чаргу, уяўлялі сталы: бяседны, ваенны, пакаяльны. Акцёры вялі дыялог адпаведнымі для кожнага лафета тэкстамі, у галоўным Кітовіча. Быў яшчэ адзін стол пад самым муром ратушы (у значнай меры бяседны), за якім тосты падымалі мясцовыя мастакі са сваімі сябрамі. Тут „непаспаліты зрух мастакоў" ішоў сваім шляхам. Парад завяршылі гарматні залп, уезд вялізнага драўлянага Пегаса, які выплёўваў феерверкі, тост валадароў ваяводства ў сармацкіх строях і пачастунак (гарачая капуста ды хлеб са шмальцам), які скаштавалі нешматлікія, бо хапіла яго толькі па прынцыпе „хто першы, той лепшы".

— Віват за ўсе падляшскія сем'і, за красу і ўражлівасць падляшскіх жанчын, за розум ды спеласць падляшскіх мужчын, — падымаў тост цяперашні ваявода Марэк Стшалінскі.

У час імпрэзы да журналіста „Нівы" падышоў суарганізатар мерапрыемства Ежы Квачынскі з Канфедэрацыі дваровай шляхты — пахваліўся, што яго згуртаванне падмацавала двух беластачан, у якіх ёсць пацвярджэнне іхных баярскіх каранёў з Беларусі.

Выстава Адама Сяменчыка

Вялікія жарсці сярод тлумна сабраных гасцей у галерэі Драмтэатра запанавалі ўвечары, у час адкрыцця выставы „Паміж" 26-гадовага Адама Сяменчыка з Гарадка (зараз жыве ў Варшаве). У рамках свята прыдалі яму назву „Тэатральна-мастацкі кактэйль". Вернісаж 12 палотнаў, папраўдзе мультымедыйны паказ, меў сваю прэм'еру ў Ам'ен у Францыі. Слайды, музыка, аўтарскія тэксты ў выкананні трох акцёраў (рэжысура і адна з роляў Марка Тышкевіча), а таксама развешаныя побач карцін, урэшце самі карціны, якія ўспыхвалі экспрэсіяй яркіх колераў. Як сцвярджае мастак, усё гэта мела „паказваць міжчалавечую прастору", тую, пра якую абвяшчаў загаловак выставы — „паміж". Акцёры, у сваю чаргу, у больш за паўгадзінным тэатральным мерапрыемстве, як сказаў рэжысёр М. Тышкевіч — „даставалі на паверхню тое, што скрываецца паміж радкамі" тэксту, раскідаліся цэлай палітрай эмоцый і пачуццяў, якія нараджаюцца паміж двума чалавекамі, жанчынай (Івона Шчэнсная) і мужчынам (Мацей Стэмпня). Прычым гледачы маглі ўбачыць феерыю колераў і абстрактных формаў толькі пасля паказу — раней былі яны завешаныя.

Пасля вернісажу сабраныя гулялі пад Драмтэатрам пад акампанемент гурту „Скальды".

Конкурс на гімн

На другі дзень святкавання ў палацы Браніцкіх гісторыкі дыскутавалі аб гісторыі ваяводства.

— Шмат хто можа здзіўляцца, што жыве на Падляшшы. З гістарычнага пункту гледжання, фактычная сталіца павінна быць, хутчэй, у Седльцах, чым у Беластоку, — сказаў прафесар Адам Дабронскі.

Пры нагодзе падляшскі маршалак аб'явіў конкурс на гімн ваяводства, які мае спасылацца на ягонае былое ды сучаснасць. Да тэксту можа прыкладацца музыка, але неабавязкова. Гімн будзе выконвацца пры нагодзе чарговых юбілеяў. Дакладныя правілы конкурсу будуць аб'яўлены пазней. Ужо, аднак, вядома, што кожны аўтар і ягоная прапанова будуць прадстаўлены на інтэрнэт-старонках Падляшскай маршалкоўскай управы.

(холм)

Не паразумеліся

Міністры замежных спраў Нямеччыны Ёшка Фішар і Польшчы Владзімеж Цімашэвіч, якія 12 і 13 верасня спаткаліся ў Белавежскай пушчы, не паразумеліся ў спрэчных пытаннях, якія апошнім часам узніклі ў польскіх і нямецкіх дачыненнях.

Кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў размаўлялі перш за ўсё аб праекце новай еўрапейскай канстытуцыі. Польскі ўрад не пагаджаецца са зменай працэдуры галасавання ў Радзе Еўропы, якая абмяжуе значэнне Польшчы ды іншых краін з меншай колькасцю насельніцтва, а выдатна ўзмоцніць буйныя дзяржавы — Нямеччыну, Францыю і Англію. Калі не ўступяць у сілу прапанаваныя ў новай канстытуцыі змены, Польшча ў Радзе Еўропы будзе распараджацца падобнай колькасцю галасоў як Нямеччына.

— Нам неабходна паразумецца ў справе еўрапейскай канстытуцыі, нават у апошнюю ноч да пашырэння Еўрасаюза на новую дзесятку краін. Інакш у Еўропе з дваццаці пяці дзяржаў узнікнуць праблемы, — сказаў Ёшка Фішар на прэс-канферэнцыі ў Белавежы.

— Мы не скрываем розніц, якія дзеляць польскіх і нямецкіх дыпламатаў у справе новай еўрасаюзнай канстытуцыі. На размовы будзе яшчэ час на міжурадавай канферэнцыі, а зараз абгрунтоўваем наша становішча, — заявіў Владзімеж Цімашэвіч.

Абодва міністры адмоўна паставіліся да ідэі стварэння Цэнтра супраць выгнанню, які займаўся б выгнанымі пасля вайны немцамі.

— Мы павінны мець на ўвазе ўсё, што будзе нагадваць нам аб II сусветнай вайне. Трэба адназначна вызначыць віну нацыянальнага сацыялізму, які выклікаў другую сусветную вайну, за смерць і злачынствы, — сказаў Ёшка Фішар.

— Мы павінны зрабіць усё, каб ніхто не мяняў гістарычнай праўды. Калі б ініцыятыва стварэння Цэнтра супраць выгнанню рэалізавалася ў яе першапачатковым выглядзе, мела б гэта адмоўнае ўздзеянне на польска-нямецкія адносіны, — сказаў Владзімеж Цімашэвіч. Пацвердзіў ён, што разыходжанні паміж Нямеччынай і Польшчай наконт вайны ў Іраку не зніклі.

Міністры наведалі запаведнік зуброў, былі ў прыгожай Мікалаеўскай царкве ў Белавежы і схілілі галовы перад помнікам 90 асобам забітым гітлераўцамі ў 1942 годзе. Нямецкі госць наведаў прыватную леснічоўку Владзімежа Цімашэвіча пад Гайнаўкай і прыняў запрашэнне прыехаць на адпачынак у пушчу. Прытым ён патлумачыў, што ў час водпуску не займаецца палітыкай, а толькі сямейнымі справамі.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ёшка Фішар (злева) і Владзімеж Цімашэвіч

Пра канікулы і не толькі

[1 ☞ працяг]

ваную бажніцу з другой паловы XVIII стагоддзя. На маім веласіпедным шляху ўсе цэрквы былі закрыты — я нават гэта разумею, — але дзе нейкая табліца з інфармацыяй пра іх, як у Дубічах-Царкоўных? Нідзе. А сакральныя аб'екты гэта ж нашы матэрыяльныя каштоўнасці ў сферы духоўнай культуры. Хто, апрача настаўнікаў, як не бацюшка можа расказаць маладому пакаленню пра нашу багатую мінуўшчыну? Даступнасць сакральных аб'ектаў прынясе карысць не толькі турыстам, але і храмам, бо да ўлад будзе даходзіць інфармацыя, што трэба ўкладваць грошы на іх аднаўленне, каб не занепадалі помнікі мінуўшчыны. Інакш кажучы, каб турыст зацікавіўся нашай падляшскай зямлёй, ён павінен мець пра яе інфармацыю ці ў турыстычных даведніках, ці ў Інтэрнэце, ці нават у штодзённай прэсе. Апрача таго, з чым цяпер ужо і не так дрэнна, павінен мець дзе заначаваць, памыцца і добра паесці.

З таго, што мне вядома, дык у Дубіцкай гміне ёсць дзе пераначаваць, памыцца і паесці, дзе ў Арлянскай — не ведаю, пра Чыжоўскую — нічога не ведаю, а пра Гайнаўскую мне вядома тое, што ў Гайнаўцы. Пра кватэры на вёсках мне нічога не вядома. Пішу пра вёскі адлеглыя ад Махнатага менш за дзесяць кіламетраў, хаця ў іх ёсць па некалькі пустых хат, у якіх можна ладзіць начлегі. У самым Махнатым можна пераначаваць у вясковым клубе і пад палаткамі на вясковым пляцы.

Хто меў бы ладзіць такую мінімальную турыстычную інфраструктуру? Думаю, што гэтым можа заняцца кожны, а напэўна аддзелы культуры ў гмінах; для гэтага не трэба вялікіх грошай, толькі ахвота і арганізацыйныя здольнасці. Маю прапанову ніўскім карэспандэнтам: распытайце пра гэта сваіх гмінных чыноўнікаў і напішыце ў „Ніву". Мо тады заахвочу некалькіх турыстаў Трыгарада наведаць не толькі Белавежу і пушчу.

А так пры нагодзе, у Махнатым, Старым Корніне і Моры стаяць пустыя будынкі па колішніх школах. У канікулы гарадскія дзеці з небагатых сем'яў нікуды не выязджаюць — чаму б не наладзіць ім пабыўкі на вёсцы? Кошт невялікі, а якая радасць і ўдзячнасць. Калі хто не ведае, як гэта зрабіць, служу вопытам. Мы ў пачатку дзевяностых гадоў арганізавалі ў Гданьску пабыўку дзецям з Гайнаўшчыны. Не было раскошна, але не ў тым справа. Найважнейшае чыстае паветра і прыгожыя краявіды, а скарыстаюць не толькі дзеці, але і вясковыя прадуктовыя крамы — у іх можна купіць усё неабходнае харчаваць дзяцей.

Мае вывады ў гэтай справе такія:

— органы мясцовага самакіравання няхай не разводзяць рук і не гавораць, што няма магчымасцей панізіць беспрацоўе; хай робяць стаўку на турызм; а як гэта зрабіць — хай думаюць або вучацца ў іншых; нельга сесці і чакаць, што турыст з'явіцца сам па сабе,

— трэба пачаць з інфармацыі — пры кожнай публічнай дарозе паставіць інфармацыйныя шыльды: ці то вялікія, ці такія дошчачкі, як каля Арэшкава пра тамашні міні-заапарк,

— павятовыя ці нават гмінныя дарогі між Орляй, Дубічамі-Царкоўнымі і Гайнаўкай — нядрэнныя для веласіпеднага турызму і яны павінны быць пазначаны для гэтай мэты; добра было б, калі б на іх быў асфальтавы насціл, так як на Борнхальме — раі для веласіпедыстаў; мо і я дачакаю такіх дарог на Гайнаўшчыне.

На веласіпедных дарогах вакол Махнатага сустракаў я адзінокіх турыстаў, значыць, нейкі пачатак ужо ёсць. І гэтай аптымістычнай акалічнасцю завяршаю свае прапановы.

Міхась Куптэль

Вачыма паляка

Маладое віно ў старых сасудах

Кажуць, блудзіць і памыляцца — чалавечая справа. У апошні час, калі прыгадваў я гэтую думку нават і не падумаў пра нейкія памылкі, якія маглі б вырашаць лёсы чалавецтва, але, так сказаць, кінуліся мне ў вочы хібы драбнейшага характару, хоць і ахоплівалі важкія справы. Вось дайшла да мяне выдадзеная ў апошні час Асацыяцыяй Віла Сакрата кніга Алеся Чобата *Ziemia św. Łukasza*, перакладзеная на польскую мову знакамітым Чэславам Сэнюхам. Беларускі арыгінал з'явіўся на свет летась. Кніжку пачаў я чытаць ад канца, значыць, ад даведкі аб аўтары, хоць тое-сёе аб ім мне вядома — хоць бы з публікацый Чобата ў „Czasopisie". У даведцы я прачытаў: „Dwa lata później ukazały się «Kresowiaki», a zatem «Nowaja Halileja»". „A zatem", ці „a następnie", а калі „zatem" — што „zatem"? — пытаўся я сам сябе. Зараз жа навеяла мне новае пытанне пасля таго, як прачытаў сказ: „Z uznaniem literackich krytyków i czytelników..." Задумаўся я, ці тут гаворка аб нейкіх „літаратурных чытачах", ці аб „літаратурных крытыках, а таксама чытачах". Гэта, аднак, дэталі. „Зямля св. Лукі" і так вартая ўвагі. Пагаджаюся з аўтарам уступу, Сакратам Яновічам, што „напісаная Чобатам гісторыя новай Беларусі пазбаўленая знясільваючай прафесаршчыны і ўтомнай храналогіі. Стварыў ён тэкст, які захапляе Чытача, які прымушае да неардынарных роздумаў". Мабыць, якраз таму, каб чытач выпадкова не стаміўся, не хапае інфармацыі выдаўца, з якога перакладу (арыгінальнага, на польскую мову Чэслава Сэнюха) браліся цытаты з Евангелля ад Лукі.

Думаю сабе, ці гэтыя вывады часамі не звычайнае начэпства. Асабліва ў кантэксце прамінулага святкавання 490-годдзя заснавання Падляшскага ваяводства, якое, як здаецца, урадавыя і самаўрадавыя ўлады ды Канфедэрацыя дваровай шляхты арганізавалі, наўмысна дапускаючы магчымасць гістарычных памылак. Паставіў ім пытанне на старонках „Нівы" доктар Алег Латышонак. Услед яго сумненняў пайшоў „Кур'ер паранны". „Сёння мы (палякі і беларусы — М. Х.) — складаем адно. Таму не трэба перабольшваць", — пракаментаваў выказванне іншы гісторык, Адам Дабронскі. Пэўна, не трэба, але ўсё ж за думкамі А. Латышонка скрываецца больш істотнае пытанне — якая тая гістарычная праўда? Дык гэта, як азагаловіў свой артыкул „Паранны" — свята палякаў, ці беларусаў якія жывуць на сённяшнім Падляшшы? А, мабыць, гэта звышнацыянальнае свята? А, можа, арганізавалі яго, як сказаў мне мой правы знаёмы, у рамках „ігрышч", бо „хлеба" бракуе. *Lewica zawłaszcza wszystko. Chce zawłaszczyć nawet historię, stworzyć własną*, — тлумачыў.

Цікава, арганізатары прытрымліваліся ў галоўным польска-каталіцкай версіі гісторыі, хоць першым падляшскім ваяводам (у тагачасных межах ваяводства) быў русін, а кароль Жыгімонт Аўгуст карыстаўся старабеларускай мовай. А ўсё тое прыгадваюць словы св. Лукі (5,37), якія я знайшоў у кнізе Алеся Чобата:

ніхто не налівае маладога віна
ў мяхі старыя,
а інакш маладое віно парве мяхі
і само выцеча, і мяхі прападуць.

А *zatem* асмелюся сказаць, што праз дзесяць гадоў будзем святкаваць 500-годдзе назначэння Івана Сапегі на пасаду ваяводы, а не дзень нараджэння ваяводства, бо тое ўзнікла ў XX стагоддзі, у рамках адміністрацыйнай рэформы дзяржавы і, як сцвярджае А. Латышонак, гэта „штучны твор". Вось, каб толькі нам „мяхі" не папрападалі ад менш ці больш намераных памылак і блуканняў!

Мацей Халадоўскі

Шведы ў гісторыі беларусаў

Нядаўна выйшла ў Беларусі кніжка Андрэя Катлярчука *Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў**. Асаблівасцю выдання тое, што аўтар выкарыстаў у ім зусім невядомыя нашым гісторыкам скандынаўскія крыніцы і літаратуру. Атрымалася, як здаецца, больш верагодная за існуючую рэканструкцыя падзеяў, асабліва тых, якія датычаць ранняга сярэднявечча. Менавіта гэты перыяд у кнізе А. Катлярчука прыцягвае асаблівую ўвагу.

Аўтар не пакідае ніякага сумнення, што Кіеўская Русь і Полацкая дзяржава былі створаны вікінгамі. У скандынаўскіх крыніцах Полацк выступае як Polateskia. Галоўнай крыніцай ведаў пра шведскую прысутнасць на беларускай зямлі былі сагі, аповесці пра вікінгаў, іх конунгах (князях) і ваенных паходах. У сагах выступаюць амаль усе тыя ж героі, што і ў кіеўскай *Аповесці мінулых гадоў*, толькі іх імёны гучаць зусім інакш, чым у стараславянскім летапісе. Полацкі Брачыслаў у *Сазе пра Эймунда* выступае як Вартылаў, Яраслаў Мудры — Ярызлейфр, Рагнеда — Рагніглд, Рурык — Рорык.

Скандынаўскі перыяд у гісторыі Беларусі пачаўся ў 862 г. разам з прыходам шведскіх плямёнаў русаў, якімі камандаваў конунг Рурык (Rorik). Сталіцай свае імперыі, якую называлі Вялікай Швецыяй, зрабіў Ноўгарад (Holmgard). Уладанне над Полацкам перадаў ён аднаму са сваіх князёў. Наступная інфармацыя ў шведскіх крыніцах пра Полацк з'явілася ў 980 годзе, калі ў гэтым горадзе княжыў Rangvald, вядомы ў беларускай гістарыяграфіі як Рагвалод. „Вікінг Рангвальд стварыў першую гістарычную дзяржаву ў Беларусі, заклаў пачатак дынастыі полацкіх князёў", — піша А. Катлярчук. Полацкае княства хутка пашырала свае межы коштам ліваў і латгалаў — продкаў сучасных латышоў. Полацк стаў канкурэнтам для Ноўгарада, дзе валодаў конунг Valdemar, вядомы ў нашай гістарыяграфіі як Уладзімір, які ахрысціў Русь. Дарога Дзвіной праз Полацк на Чорнае (Варажскае) мора была карацейшай, чым тая праз Ноўгарад. Той, хто трымаў уладу на гэтай тэрыторыі, кантраляваў гандаль паміж Балтыйскім і Чорным морамі. Дарога з поўначы вяла праз Konugard (Кіеў), які быў другім горадам у дзяржаве Valdemara-Уладзіміра.

А. Катлярчук на аснове шведскіх крыніц даказвае, што татальная вайна паміж Ноўгарадам і Полацкам была вынікам вялікіх уплываў шведскіх купецкіх карпарацый, якія перадалі грошы Уладзіміру на арганізацыю войска супраць Полацка. Конунг рыхтаваўся да вайны тры гады (977-980) і, сабраўшы ў Скандынавіі вялікае войска, пачаў вайну з Рагвалодам. У яе выніку была знішчана полацкая дынастыя, а князева дачка Рагнеда — згвалтавана пераможцам. Нарадзіла яна Уладзіміру сыноў, якія пасля валодалі ў Кіеве і Полацку, а іх нашчадкі яшчэ сто гадоў вялі паміж сабой вайну за кантроль балтыйска-чарнаморскага гандлёвага шляху. Полацкая дзяржава пражыла свой залаты перыяд, калі князем стаў там праўнук Рагвалода, Усяслаў Чарадзей. Полацк кантраляваў тады вялікую частку балтыйскага гандлю, а спробы Кіева, дзе валодалі нашчадкі Уладзіміра, падпарадкаваць Усяслава закончыліся паражэннем.

Цікава прадстаўляе А. Катлярчук хрышчэнне Русі. Бачыць ён гэтую падзею як частку працэсу хрышчэння скандынаўскіх уладанняў у Еўропе. У 912 г. адбылося хрышчэнне Нарманды, у 943 г. — шведскага княства Ервік, што ў Ангельшчыне, у 965 г. пачалося хрышчэнне Даніі, у 995 г. — Нарвегіі, у 1008 г. — Готланда, а у 1050 г. — Швецыі. Вікінг Вальдэмар прымаў хрэст як адзін са скандынаўскіх уладальнікаў у Еўропе.

У Полацку хрысціянства з'явілася за справай скандынаўскага місіянера Торвальда, які і закончыў там свой жыццёвы шлях. Аднак дзяржаўнай рэлігіяй учыніла яго Рагнеда, якая заснавала ў Заслаўі першы на беларускай зямлі манастыр.

А. Катлярчук у сваёй кніжцы прадстаўляе тысячагадовую гісторыю беларуска-шведскіх адносін, не толькі палітычнага, але таксама культурнага і гаспадарчага характару. Скандынаўскія крыніцы далі яму магчымасць прыблізіць мінулае з другога пункту гледжання. Такія распрацоўкі надта патрэбныя беларускай гістарыяграфіі.

Яўген Мірановіч

* Андрэй Котлярчук, *Шведы ў гісторыі й культуры беларусаў, Менск 2002, выд. Энцыклапедыкс, сс. 272.*

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Старажыл Мікола Абмётка памятае маёнтак і ўласнікаў

На радзіме Уладзіслава Сыракомлі

— Запрашаем на святкаванне, прыязджайце ў госці! — чуем на развітанне. Ада Уладзіміраўна Рудзько, намеснік дырэктара па выхаваўчай працы, раней пазнаёміла нас са школай. Уражаныя тут беларускім духам не шкадуем пахвал і добрых слоў.

29 верасня г.г. у Смольгаве ўрачыста адзначаць 180 гадавіну з дня нараджэння Уладзіслава Сыракомлі. Прыедуць даследчыкі і літаратары з Мінска (ды не толькі), будуць даклады і чытанні, знаёмства з месцамі паэта і наваколлем. З гэтай нагоды ў школе адкрыюць новы музей і камень з табліцай у гонар патрона і слаўнага ўраджэнца.

* * *

У Смольгаў трапілі мы ў палове жніўня, у апошні дзень вандроўкі па Палессі. Мясціна распаложана непадалёк Любані на Случчыне. Тутэйшы краявід пазначаны чырвона-шэрымі горамі солі і курадымячымі камінамі шахтаў.

У Смольгаве, які знаходзіцца два кіламетры ад галоўнай шашы, панавала ранішняя дрымата. Недзе ў палове вёскі, ля крамы, сустракаем кабет.

— А дзе тут двор стаяў? — паясняем, што ідзе нам пра паэта Сыракомлю.

— А... гэта недалёка. Вось, запытайце ў тых, што *забор* ставяць.

— Мы нетутэйшыя! — зразу адказваюць тыя, але калі называем імя „літоўскага лірніка", дачнікі ведаюць, у чым справа.

На месцы жыве старажыл Мікола Абмётка. Дзеду за дзевяноста, памятае маёнтак і ўласнікаў. Ёсць толькі праблема, ён глухаваты. У ролю пасрэдніка ўключаецца дзедава дачка, яна яшчэ раз паўтарае нашы пытанні.

— Да вайны (першай) быў у нас пан Мажэйка, — успамінае стары, — пасля маёнтак перайшоў на сына-п'яніцу і ўсё прапала. Апошняе даканала вайна, згарэлі будынкі, а зямля пад калгас пайшла.

Мікола Абмётка паказвае частку вуліцы і агароды, дзе і зараз знаходзяць адломкі керамікі. На дарогу гаспадары частуюць яблыкамі з садка, што вырас на месцы былога фальварка.

* * *

Можна здагадацца, як выглядаў першы дом паэта — сустрэнем яго на малюнках Напалеона Орды. Невялічкі драўляны дом стаіць пад саламянай страхой. Аздабляе яго ганак, абапёрты на чатыры драўляныя калоны. Побач два гаспадарчыя будынкі, далей невялікі домік для чэлядзі. Пасярод двара ўзвышалася вялізная таполя, а пад ёй стаяла альтанка.

У двары была багатая бібліятэка. Аляксандр Кандратовіч, бацька паэта, цікавіўся сусветнай гісторыяй, гадзінамі мог апавядаць пра Цэзара, Сакрата, Платона, Гамэра. Як рамантык і дэмакрат, з увагай ставіўся да вясковага люду. Часта пабываў на яго святах, захапляўся песнямі і легендамі. Больш вынаходлівай і прадпрымальнай была Вікторыя са Златкоўскіх, маці паэта; яна часцей за мужа кіравала гаспадаркай.

Са Смольгавам звязаныя найлепшыя ўспаміны ў жыцці Вікторыі і Аляксандра. У год, калі нарадзіўся Людвік, зямля падарыла ім небывалы ўраджай. Яны, збяднелыя арандатары, урэшце маглі заплаціць частку даўгоў, якія цягнуліся за сям'ёй. Праўда, народзіны сына маці ледзь не прыплаціла смерцю, пасля родаў расхварэлася і праляжала некалькі месяцаў.

* * *

Сёння субота і канікулы. Каб дабрацца ў сярэдзіну школы, трэба найперш адшукаць дырэктара. Дапамагае нам ветлівы настаўнік хіміі. Калі здзіўляемся яго цудоўнай беларушчыне, адказвае:

— У нас усе прадметы вядуцца па-беларуску.

У Смольгаве Сярэдняя школа, у ёй 118 вучняў, якіх навучае 18 настаўнікаў. Будынак з белай цэглы пабудаваны ў пачатку 90-х гадоў, над уваходам красуецца лозунг: „Калі ласка, заходзьце!", а на пляцоўцы перад школай мора кветак.

Праз некалькі хвілін сустракае нас Ада Рудзько. Пані дырэктар папярэджвае, што ў іх рамонт, школа рыхтуецца да святкавання гадавіны. У школе адкрыюць новы музей Уладзіслава Сыракомлі. Пакуль што, можам паглядзець падрыхтаваныя стэнды.

— Іх аўтарка — Надзея Скрыпнік, — адзначае дырэктарка, — настаўніца беларускай мовы.

Стэнды ўражваюць густоўнасцю і прафесійным выкананнем. Надзея Скрыпнік супрацоўнічала з сыракомлезнаўцам Уладзімірам Мархелем, ездзіла па матэрыялы ў Мінск.

Пытаем пра гісторыю патрона школы. Аказваецца, імя Уладзіслава Сыракомлі прысвоілі дзесяць гадоў назад.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У краязнаўча-гістарычным музеі, які знаходзіцца ў гэтай самай школе, пабачым дакумент падпісаны Вячаславам Кебічам. Пра слаўнага ўраджэнца памяталі ў Смольгаве і раней. У яго гонар быў тут пакойчык са сціплымі памяткамі.

* * *

Смольгаў не захаваўся ў памяці паэта. Калі Людвіку пайшоў трэці год, бацькі пераехалі ў Яськавічы, чарговы фальварак у палескай глушы. Аднак пра першае месца паэт захаваў найлепшыя ўяўленні. На гэта паўплывала настальгія бацькоў, якія са Смольгавам спалучалі самыя шчаслівыя гады жыцця.

Нараджэнне будучага „лірніка вясковага" таксама ахінутае цудоўнымі легендамі. Кволыя бацькі доўга не мелі дзяцей. Сынка мела падарыць ім Дзева Марыя, якая пачула малітвы і прагныя просьбы Вікторыі. Гэта было на свята Нараджэння Хрыстова ў Фарным касцёле ў Нясвіжы напрыканцы 1822 года. Праз дзевяць месяцаў нарадзіўся Людвік.

Знаёмства з настаўнікамі і школай ў Смольгаве таксама паказалася самым светлым вобразам беларускай правінцыі. Дбайны і цікавы пераказ памяці, ад якога нараджаецца пачуццё нацыянальнага гонару, маладому пакаленню — найбольш сэнсоўны.

Ганна Кандрацюк

Мікола Гайдук

Мроі (4)

(заканчэнне; пачатак у 36 н-ры)

Горш было з вашпаніхай. Тая мела брыдкую звычку заталіцца дзе-небудзь у цёмным кутку, прылапаць нявольніка на нечым недазволеным і потым, абвясціўшы ўсім аб учыненым злачынстве, загадаць Раўдусу, каб усыпаў вызначаную ёю ж колькасць пабояў. Пры тым яна любіла назіраць, ці наглядчык належна выконвае яе волю, а калі ёй здавалася, што той не надта дбае пра яе загады, вырывала з яго рукі канчук ды сама шпарыла ахвяру да таго часу, пакуль не насыцілася стогнамі і енкамі ахвяры. Асабліва ахвотна збівала да паўсмерці маладых ды прыгожых нявольніц. І то без дай прычыны. Даволі было, каб нявольная замарудзіла нешта пры вязанні снапоў у полі ці над верацяном уздрамнула або каля жорнаў лішняе замешкалася, як зараз жа канчук ішоў у работу.

Што ж... Не раз і не два ўпіваўся едкі суровец канчука і ў Чарнушчыны плечы. Хоць і без прычыны, бо Чарнушка з ног валілася, але ад цямна і да цямна ад работы не разгіналася. Мела для каго: яе сыну пайшоў трэці гадок, і хлопчык ні на крок не адставаў ад маці. Калі не на слабенькіх яшчэ ножках, дык ракачом спяшаўся да яе ў малтуве-пякарні і на падворку, у клеці каля жывіны і ў полі ў часе жніва. Абедзвюма ручкамі хапаўся за матчыную спадніцу, лашчыўся да ног або схіленага да зямлі твару, бо рукі яе былі заўсёды заняты работай. А калі ўжо ўночы — шорсткія і патрэсканыя яны — спачывалі на саломе, ён хаваў у іх раскрытыя далоні свой маленькі тварык і абцалоўваў кожны палец, быццам разумеў, што толькі яны і кормяць, і поюць іх пры жыцці. Чарнушка ў такіх выпадках баранілася, хавала рукі, але ён намагаўся іх знайсці. Як яму гэта не ўдавалася, пачынаў горка-горка плакаць. Калі малалетак здавальняўся гульнёю, тады ролі мяняліся. Яна набліжала да сябе яго твар і пільна высочвала на ім кожную дробязь, што магла радніць сына з бацькам, якога ў сваіх думках даўно ўжо пахавала ў далёкім Драгічыне. І, адкрыўшы нешта новае, дагэтуль ёю непрыкмечанае: ці крапінку-мушку на шыі ці мяккую почку на вушку, абцалоўвала іх прагавітымі матчынымі вуснамі. Ад ласкоткі дзіця заходзілася смехам. А яна нават і ў ім вылоўлівала дарагія ёй гукі Цюймавага залівістага рогату.

І трэба ж было здарыцца, што на такія вось гульні маці з дзіцём пры збіранні жалудоў у дуброве каля кемаса, надышоў сам вашпан Перпуоліс. Колькі часу ён прыглядаўся гэтым забавам, Чарнушка не ведала, але калі паднялася з шалясткога асенняга лісця, каб узваліць сабе на плечы цяжкі мех і несці яго ў двор, заўважыла стаяўшага побач Перпуоліса. На яго твары гуляла шчаслівая ўсмешка. Ён прысеў да хлопчыка, узяў яго сабе на калені, загаварыў ціхім лагодным голасам. Дзіця, адчуваючы іншую, чым матчыная, невядомую яму, але, відаць, усёй істотай пажаданую, мужчынскую ласку, прытулілася да Перпуолісавых грудзей. Яго шырокая далонь далікатна спачыла на хлапечай галаве. Чарнушка стаяла, як укопаная, любавалася гэтай незвычайнай з'явай і не заўважыла, як да яе падышла вашпаніха і прашаптала:

— Ну, чаго стала, бы пень?.. Жалуды ў двор нясі!.. — І глянула на Чарнушку такімі вачыма, што тая ўся залекацела, бы асіна на ветры.

Зорка

старонка для дзяцей

Ніна Мацяш

Ясікава гора

Плача Ясь:
— Нешчаслівы я, мусіць:
То сляпак, то камар мяне ўкусіць.
А цяпер вось аса наляцела,
Ёй таксама кусацца карцела.

Завяду асаеда сабе,
Хай хоць восаў тых ён падзяўбе!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Эвеліна Вышкоўская з Ягуштова знаёміцца з ткацкім мастацтвам. Дзяўчынка ўдзельнічала ў курсах рукадзелля і спеву, якія ў час канікул наладзіў музей у Студзіводах

Літаратурныя спробы маладых аўтараў

У гэтым нумары „Нівы" мы можам пазнаёміцца з лаўрэатамі VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы. У лаўрэатах конкурсу апынуліся **Аня Артэмюк** з Парцава, **Уршуля Пташынская** з Церамкоў, **Наталля Кандрацюк-Свярубская** і **Радаслаў Мацієвіч** з Беластока.

На нашых старонках мы прадставім самыя цікавыя творы. Кожны з вас будзе мець магчымасць напісаць аўтару і падзяліцца з ім сваімі ўражаннямі і заўвагамі. На думку рэдакцыі, узровень дасланых прац быў вельмі няроўны. Многія аўтары пакарысталіся сляпым паўторам не заўсёды ўдалых узораў. Найбольш уражвае наіўнасць гімназістаў — з іхніх радкоў павейвае дрымотнай нудотай, схематычнасцю, не хапае ў іх эмоцыі ды адчування слова. Выглядае, быццам цікавасць да творчасці абумоўлена прагай заваяваць узнагароду.

Нярэдка дзеля гэтага спрычыняюцца бацькі і старэйшыя сябры. Нядаўна я падслухала гутарку між дачкой і мамай. Дачушка мела напісаць апавяданне пра сваю канікульную прыгоду.

— No przecież widzieliśmy lisa! — падкінула думку маці. Дзяўчынка захіхатала і іранічна адрэзала:

— A w zeszłym roku to widzieliśmy dzika!

* * *

На працягу гадоў працы з моладдзю я пераканалася, што і ў нас могуць з'явіца таленавітыя аўтары. Найбольшыя дасягненні ў тых, якія зразу пісалі па-беларуску, крок за крокам адкрываючы асаблівасць і прыгажосць мовы.

У сённяшняй „Зорцы" мы прапануем вам апавяданне мінскай гімназісткі п.з. „Каўбас і Кефір". Вольга Лешчанка прыкмеціла, здавалася б, звычайную і сумную карціну — хатніх жывёл на сметніку, якіх выкінулі з хаты гаспадары. На аснове гэтага вобраза дзяўчынка напісала прыгодніцкае апавяданне з элементамі дэтэктыва. Між радкамі адчуваецца начытанасць і багатую фатназію аўтаркі, таксама дзіцячы эмацыйны погляд на праблему пакінутых жывёл.

На канец, каб падвесці нашы разважанні, адна падказка: не паўтарайце наслепа тэм і стылю сваіх школьных сяброў (хай сабе і ўзнагароджаных). Шукайце сваіх матываў, тэм ды ідэй, якія вас цікавяць і кранаюць, якія халююць ці радуюць. А ўзораў і дапамогі трэба шукаць у агульнапрызнаных аўтараў, класікаў. У апошнім выпадку заўсёды дапамогуць вам вопытныя настаўнікі.

Зорка

Каўбас і Кефір (сучасная казка) — 1

Жорсткая доля

У маленькім гарадку Н., на адной сметніцы, каля аднаго кантэйнера жыў кот Кефір. Так яго звалі таму, што калі ён жыў у хаце, дык разбіў, гарэзнічаючы, бутэльку кефіру. Гаспадыня, перш чым выкінуць ката на вуліцу, бязлітасна біла яго папругай і прыгаворвала:

— Вось табе кефір!.. Вось табе кефір!..

З таго часу і пайшло: „Кефір".

Каля другога кантэйнера таксама жыў кот, якога звалі Каўбас. Калі ён жыў у гаспадароў, якія яго кепска кармілі, дык сцібрыў кольца каўбасы. Яго таксама білі, прыгаворваючы:

— Вось табе каўбаса!.. Вось табе каўбаса!.. Каўбас, ненасытны!

З таго часу і пайшло: „Каўбас".

Кефір і Каўбас доўга не ведалі адзін аднаго. У кожнага з іх быў адзін клопат: дзе разжыцца ежай, каб не памерці з голаду?

Але аднойчы яны ўсё-такі пазнаёміліся. Вось як гэта адбылося...

Кефір вечарам вяртаўся з кустоў каля дома, у якіх спрабаваў паляваць на птушак. Адчуваў ён сябе вельмі кепска, быў збянтэжаны: не ўпаляваў ні адной птушачкі. Зрэшты, змалку ён быў хатнім катом, бацькоў сваіх не памятаў, і ніхто яго паляўнічай справе не навучыў.

Кефір ажно падаў з неядзі і вырашыў пашукаць хоць што ў кантэйнеры. Увогуле ж Кефір быў вельмі сарамлівым і крышачку палахлівым катом. Калі б ён ведаў, што гэта не яго кантэйнер, то ні за што б у яго не палез. А калі залез — дык, о цуд! — там быў кавалак каўбасы. „Мабыць, нехта памылкова выкінуў", — падумаў Кефір. Ён ужо наважыўся адкусіць кавалачак, як раптам у кантэйнер скокнула нешта страшэннае, выгнула хвост трубой, зашыпела, ваяўніча замяўкала:

— Гэта мой кантэйнер! Гэта мая каўбаса! — Кефір не ведаў, што гэта Каўбас, але зразумеў, што той будзе біцца да апошняга, і да смерці спалохаўся, замяўкаў як рэзаны:

— Я не вінаваты!.. Мяне нядаўна выкінулі. Я пераблытаў кантэйнеры.

Каўбас і Кефір (сучасная казка) — 2

Знаёмства

Каўбас, заўважыўшы, што няпрошаны госць спалоханы, пачаў разглядаць яго, маўляў, хто такі.

Тым часам Кефір, выбраўшы момант, кінуўся наўцёкі. Але дзе там! Каўбас быў мацнейшы за яго, большы і дагнаў Кефіра ў два скачкі, схапіў за хвост і ўжо наважыўся добра-такі адлупцаваць. Той жаласліва замяўкаў. Трымаючы яго за хвост, Каўбас спытаў:

— Дык цябе сапраўды нядаўна выкінулі?

— Так, — адказаў праз слёзы Кефір. — За кефір...

І Кефір, нічога не ўтойваючы, расказаў Каўбасу сваю гісторыю.

— Трэба ж... — сказаў, спачуваючы, Каўбас, адпусціў хвост Кефіра і задуменна пачасаў лапай за вухам! — А зараз паслухай, што было са мной...

І Каўбас расказаў Кефіру пра тое, што з ім здарылася ў доме, у якім ён жыў. Гэта гісторыя здалася Кефіру яшчэ больш жудаснай, чым яго асабістая. Мабыць, ён зарумзаў бы, але Каўбас сказаў:

— Давай сябраваць. Мы ж з табой падобныя.

— Давай, — узрадаваўся Кефір і падаў Каўбасу лапу, на якой, між іншым, не зусім абачліва схаваў кіпцюры.

— Схавай, — сказаў Каўбас, адчуўшы іх у сваёй лапе, — не бойся.

Потым Каўбас пароўну падзяліў каўбасу, а калі яны павячэралі, смачна аблізнуўся, сказаў:

— Слухай, у мяне ёсць ідэя.

— Якая? — насцярожыўся Кефір, ужо ведаючы, што яго сябра — забіяка.

— Нас білі? — спытаў Каўбас.

— Было... — уздыхнуў Кефір.

— Дык давай адпомсцім нашым былым гаспадарам. І наогул, — працягваў Каўбас, — каўбаса, якую я тады сціб... — ён запнуўся, — узяў, была зусім нясмачная. Але зразумела было б, калі б за салямі выкінулі, а то за доктарскую, — пакрыўджана сказаў Каўбас.

Пятрусь

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Наш верны чытач Пятрусь Герасімюк з Арэшкава жартоўна правучыў публіку дэкламатарскага конкурсу. Хлопчык выступіў на сцэне Нараўчанскага дома культуры з вершам Віктара Шведа „Не думай ніколі, што ўмееш даволі". У сувязі з пачаткам новага навучальнага года варта прыгадаць усім школьнікам гэты залаты прынцып! Асабліва тым, якім навуковага ўздыму хапае толькі на першыя тыдні.

Пятрусь увесь школьны год і канікулы паспяхова рашаў зорчыны крыжаванкі. Ён выйграў гурбу ўзнагарод, сярод іх — шэдэўр дзіцячай літаратуры „Усе нашы дзеці з Булербю" Астрыд Ліндгрэн у перакладзе на беларускую мову.

У конкурсе „Роднае слова" пяцікласнік атрымаў вылучэнне.

ЗОРКА

Каўбас і Кефір (сучасная казка) — 3

Сакрэтныя намеры

— Як адпомсцім? — спытаў Кефір, успамінаючы, як яго балюча білі, перш чым выкінуць.

Каўбас паглядзеў навокал, потым нахіліўся да яго вуха і шэптам выклаў свой план.

— Не, — сказаў Кефір, цярпліва выслухаўшы яго. — Я на такое не згодны. Нам яшчэ больш пападзе.

— Таксама мне сябра называецца! — грэбліва сказаў Каўбас. — Ты баязлівец, а не сябра!

Каўбас ужо хацеў саскочыць з кантэйнера, пайсці прэч. Кефіру было боязна заставацца аднаму ў чужым кантэйнеры, ды вельмі ж крыўдна было за мінулае і за тое, што баязліўцам назвалі.

— Пачакай! — сказаў ён. — Я пажартаваў...

Назаўтра, пабраўшы палкі і камяні, налавіўшы ў бляшаначку мурашоў, Кефір і Каўбас накіраваліся да дому цёці Моці, былой гаспадыні Каўбаса. Счакаўшы ў кустах, калі гаспадыня пайшла з вялізнай сумкай у краму, сябры праз адчыненую фортачку забраліся ў кухню. Каўбас адразу ж пачаў раздзіраць цэлафанавыя мяшочкі з мукой і крупамі і пускаць туды мурашоў.

— Можа, не трэба? — пытаў Кефір.

— Наб'ю! — настрашыў Каўбас.

— Трэба, значыць трэба, — уздыхнуў Кефір і пачаў дапамагаць сябру.

Раптам Каўбас убачыў мыш, якая выскачыла з-за вядра са смеццем, пагнаўся следам, злавіў.

— Прыйдзецца ахвяраваць, — уздыхнуў ён і паклаў у адзін мяшочак.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Каты ў... Кошках

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Бася

Барбара Кубай — вучаніца V класа Пачатковай школы ў Орлі. Дзяўчынка дэкламавала верш Максіма Танка „Журавель і чапля". Гэтая жартаўлівая казачка, напісаная класікам у вершаванай форме, карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод дэкламатараў. З года ў год яе прадстаўляюць дзеці з многіх школ. Звычайна ў ролю сварлівых ды ганарыстых птушак увасабляюцца дзяўчынкі. Відаць, падабаецца ім тэма залётаў і смешныя дыялогі герояў казкі. Цікава таксама, што „Жураўля і чаплю" часта выбіраюць школьнікі з Орлі! ЗОРКА

Каўбас і Кефір (сучасная казка) — 4

Помста, салодкая помста

Нарабіўшы шкоды, сябры вылезлі праз фортку на вуліцу, селі на падаконнік і пачалі цярпліва чакаць, што з усяго гэтага выйдзе.

Доўга ці нядоўга чакалі — з'явілася цёця Моця з сумкай загружанай ежай. Зайшла на кухню і на імгненне самлела: усюды рассыпана мука, крупы, а ў мяшочку на стале кідаецца мыш!

Цёця Моця страсянула галавой, апрытомнела і пачала званіць у міліцыю. Міліцыя прыехала хутка. Цёці Моці далі нешта панюхаць, а затым два міліцыянеры па загадзе міліцэйскага начальніка, прыклаўшы кожны да вока павелічальнае шкло, пачалі аглядаць кухню. Агледзеўшы яе, нешта прашапталі на вуха міліцэйскаму начальніку.

— Тут толькі сляды ад каціных лап і хвастоў, — сказаў цёці Моці міліцэйскі начальнік, — і ніякіх зладзеяў!..

Праз хвіліну нашы мсціўцы задаволена беглі да дому цёці Полі, былой гаспадыні Кефіра. Сябры такім жа чынам, праз фортачку, залезлі на кухню — там у той час нікога не было. Тут яны зрабілі тое ж, што і на кухні цёці Моці. Вось толькі мышкі не знайшлі. І адразу ж вылезлі на вуліцу, прытаіліся на падаконніку, сталі чакаць.

Цёця Поля зайшла на кухню, спяваючы песеньку. Яна адчыніла халадзільнік, узяла мяшочак з каўбасой, куды сябры запусцілі мурашоў, закрычала, выпусціла яго з рук і стала званіць у міліцыю.

Міліцыя прыехала хутка. Цёці Полі таксама далі нешта панюхаць. Затым ужо сам міліцэйскі начальнік праз павелічальнае шкло абследаваў кухню і сказаў:

— Тут толькі каціныя сляды і ніякіх зладзеяў няма.

Саскочылі Каўбас і Кефір з падаконніка і, задаволеныя, пабеглі да сваіх кантэйнераў. А калі вы хочаце больш даведацца пра Кефіра і Каўбаса, то загляньце ў маленькі гарадок Н., туды, дзе побач стаяць два сметнікавыя кантэйнеры. Па сакрэце скажу вам, што там зараз працуе бюро дапамогі катам, якіх гаспадары б'юць і выкідваюць на вуліцу або проста так, або за якую шкоду. Катоў на сметніках вельмі шмат, Каўбас і Кефір някепска зарабляюць на сваёй новай працы.

Вольга ЛЕШЧАНКА, г. Мінск,
Тэхналагічная гімназія № 13

Першыя дні ў школе

Першы дзень у школе! Закончыўся свабодны час, зноў пачалася навука. Я баялася крыху школы, вядома, у гэтым навучальным годзе чакае мяне і маіх аднагодкаў гімназічны экзамен. Але мой страх перамагла радасць ад спаткання з сябрамі і сяброўкамі, з якімі я не бачылася некалькі тыдняў. У 9 гадзін раніцы ўсе гімназісты сабраліся ў актавай зале ды выслухалі прамову дырэктара школы. Дзе-нідзе сярод вучняў чуваць было смех — яны дзяліліся між сабою ўспамінамі з летніх шаленстваў і прыгод. Шкада, што канікулы за плячамі.

Пасля прывітальнай урачыстасці мы пайшлі на спатканне з нашымі выхавацелямі, дзе, між іншым, атрымалі план першых заняткаў. Спачатку крышку трывожыла мяне думка, што зноў трэба будзе рана ўставаць і хутка рыхтавацца ў школу.

Наступнага дня я ўстала рана, паснедала і хуцелька выйшла ў школу. За плячыма ізноў была цяжкая торба з новымі кніжкамі і незапісанымі яшчэ сшыткамі. Па дарозе я пазяхнула некалькі разоў. Гэта зразумелае, бо, пэўна, усе неспакойна спалі гэтай ночы. Я не паспела задумацца, а ўжо апынулася ў дзвярах школы.

На першых уроках у класах завялася гамонка. Эх! Трэба было нам даведацца, што чуваць у сяброў, дзе пабывалі і як адпачывалі. Мы размаўлялі аб канікулах, бо, вядома, што на перапынках не хапала нам часу. Гоман перашкаджаў настаўнікам і яны доўга супакойвалі нас.

Так распачаўся новы навучальнаы год. Пачалася новая навука і новыя абавязкі. Але адно не змянілася праз канікулы — у школе асталася тая ж прыемная атмасфера.

Наталля ТАРАСЕВІЧ, III „б" кл.
Гімназіі Комплексу школ
з дадатковым навучаннем
беларускай мовы ў Гайнаўцы

Польска-беларуская крыжаванка № 39

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 35: Кіт, мята, трус, рака, зад, банан, ара, ваўкалак, мак, Ірак. Трава, ранак, рукаў, санкі, яр, ар, зала, матрос, Кадак.

Узнагароды — **аўтаручкі** — выйгралі: **Наталля Сцепанюк** з Беластока, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Folk Brothers" прэзентаваў нямецкую музыку

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гейналісты з Белавежы

Нацыянальная разнароднасць „Ператоча"

У час Мастацкіх інтэграцыйных сустрэч „Ператоча", якія 13 і 14 верасня арганізаваў у Белавежы Фонд „Царкоўная музыка" з Гайнаўкі пры дапамозе Белавежскага асяродка культуры, прэзентавалася беларуская, польская, украінская, яўрэйская, нямецкая і ромская культура. Жыхары Белавежы і турысты мелі нагоду пазнаёміцца з песнямі, якія выконвалі калектывы з Падляшша і Любліна.

— „Ператоча" — гэта месца перад токам у гумне, на якім выконвалі цяжкую працу — малацьбу. Арганізаваліся на ім таксама вяселлі і вясковыя забавы. З'яўляецца яно сімвалам багацця нашай культуры і адкрытасці. Адкрытым на ўсіх з'яўляецца і наша мерапрыемства, — заявіў дырэктар Фонду „Царкоўная музыка" Мікола Бушко. — Гэта мая чарговая прапанова для Белавежы (ідэя белавежскага „Купалля" выйшла ад Канстанціна Майсені, Міхала Байко і мяне).

Мерапрыемства пачалося выступленнем пушчанскіх гейналістаў і Калектыву песні і танца „Малое Падляшша" з Сямятыч. Вучні паказалі польскія народныя танцы і песні. Калектыў „Маланка" з Бельска-Падляшскага прадставіў беларускія песні ды захапіў публіку прыгожым спевам. Члены капэлы „Дравутня" з Любліна праспявалі ўкраінскія і лэмкаўскія песні. Сабраным спадабалася ігра на мандаліне, флейце і скрыпцы. На другі дзень пасля гейналістаў спявалі жанчыны з Курашава. Пачалі яны сваё выступленне дажынкавымі песнямі, а кіраўнік калектыву Ніна Грыгарук сола выканала прыпеўкі. Маргарыта Карпюк з Гайнаўскага белліцэя выступіла з дзвюма песнямі на беларускай мове. З песняй „За туманам" перайшла яна ў фінал конкурсу ў папулярнай тэлеперадачы „Ідал". Прыступіла яна да конкурсу ў ліку 9 тысяч аматараў і зараз будзе змагацца за перамогу разам з 34 адабранымі камісіяй асобамі. У нямецкіх народных касцюмах выступілі члены калектыву „Folk Brothers" з Беластока, якія прадставілі тырольска-баварскую музыку. Яўрэйскі фальклор прэзентавала „Cymes Kapela" з Беластока, а цыганскі — калектыў „Andro Verde", таксама з Беластока.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Маргарыта Карпюк з Гайнаўскага белліцэя

— Паказваем культуру, якая развівалася на абшары Белавежскай пушчы і ў яе наваколлі. Жывуць у нас беларусы, палякі, украінцы, рускія. Трэба памятаць таксама пра яўрэяў, якіх многа жыло ў Белавежы, Нараўцы, Свіслачы, Пружанах ды немцаў, якія некалькі соцень гадоў былі ў нас найлепшымі лесніками. Іх працу добра ацанілі польскія каралі і рускія цары. Многа немцаў жыло ў Бярнацкім Мосце. Засталіся ў нас яшчэ прозвішчы Мілер, Мерынг, Корх, Сац, Вапа. Паколькі развівалася ў нас перад усім беларуская культура, на плакатах змясцілі мы беларускі калектыў, які фатаграфаваўся ў нашым скансэне. Формула арганізавання мерапрыемства ў будучыні адкрытая, — заявіў дырэктар Фонду „Царкоўная музыка" Мікола Бушко.

Фонд „Царкоўная музыка" займаецца прапагандаваннем царкоўнай музыкі (ён жа арганізатар Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі) і свецкай культуры. Цэнтр прамоцыі рэгіёна, які дзейнічае пры Фондзе, займаецца свецкай культурай і быў адказны за арганізацыю мерапрыемства ў Белавежы, якое атрымала дафінансаванне Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча-Беларусь".

— „Ператоча" — мерапрыемства, якое расслаўляе культуру Белавежы і наваколля. Будзем намагацца арганізаваць яго і ў наступным годзе, каб замацавалася яно як наша пастаяннае мерапрыемства, — сказала выконваючая абавязкі дырэктара Белавежскага асяродка культуры Аніта Гвай.

Аляксей Мароз

Вынікі VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Лаўрэаты — ужо вядомыя

На VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы, аб'яўлены Рэдакцыяй „Нівы" і Беларускім саюзам Рэспублікі Польшча, сёлета паступіла 39 прац, у тым ліку 18 у I групе (дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій) і 21 — у II групе (моладзь сярэдніх школ і дарослыя). Сярод аўтараў дасланых прац упершыню ў конкурсе прынялі ўдзел 14 дэбютантаў (I група — 10, II — 4).

12 верасня 2003 г. у Беластоку адбылося пасяджэнне конкурснай камісіі, якую састаўлялі вядомыя паэты Надзея Артымовіч і Ежы Плютовіч ды літаратуразнавец Янка Трацяк.

Конкурсная камісія вырашыла адзначыць лепшыя творы ніжэйпералічаных аўтараў:

I група

У катэгорыі паэзіі:

— Анна Артэмюк з Парцава („Андзя") — за вершы „Сабака" і „Лісіца".

— Уршуля Пташынская з Церамкоў („Кветка") — за вершы „Лета" і „Зайчык".

У катэгорыі прозы журы заўважыла працы наступных аўтараў:

— Наталля Кандрацюк-Свярубская з Беластока („Пляткарка").

— Радаслаў Маціевіч з Беластока („Сцарбуль").

II група

У катэгорыі паэзіі журы вылучыла наступных аўтараў:

— Славамір Кулік з Гайнаўкі („Кус") — за падборку вершаў.

— Віталь Воранаў з Чарлейна Вельканольскага ваяводства („Кровазваротнік") — за верш „Рубікон".

У катэгорыі прозы вылучэнне атрымаў Анатоль Маўчун з Познані („Ян Надзея").

Журы адзначыла, што матэрыял першай групы вылучаецца большай разнастайнасцю і жывасцю.

Падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца на адмысловай сустрэчы ў Беластоку ў канцы кастрычніка.

(вл)

Свята Гарадка

14 верасня Гарадок святкаваў сваё 505-годдзе. Галоўная ўрачыстасць адбылася на беразе вадасховішча ў Зарэчанах. Стаяла сонечнае, цёплае надвор'е — прыемна было пабываць над вадой. Тут ад сёмай гадзіны раніцы вудзільшчыкі спаборнічалі за Кубак войта Гарадоцкай гміны. Прыехалі аматары рыбалкі з Беластока і Супраслі, прыйшлі з Гарадка. Як потым стала вядома, галоўны прыз заваяваў Дарыюш Горчак.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Падвялі вынікі літаратурнага конкурсу на найлепшы верш пра гарадоцкае культурнае мерапрыемства „Сяброўская бяседа". Пераможцам стаў Ян Грыцук з Гарадка.

Пасля паказу на сцэне новых узораў моды, а была ўжо 15 гадзіна — пачалася мастацкая частка. Выступілі ажно 16 калектываў! Пачала канцэрт „Калінка" з Залук. За ёй былі выступы хору „Расспяваны Гарадок" і капэлы „Хутар" з Гарадка, „Цаглінак" са Старога Ляўкова. Песні перапляталіся танцамі ў выкананні калектываў, які дзейнічаюць у Гайнаўскім доме культуры. Публіку прыводзілі ў здзіўленне ды смяшылі клоуны на хадулях.

Да 19^{30} выступілі: хор „Крыніца" з Беластока, хор ГДК, „Каліна" з Залук, „Куранты" і „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, „Сакрэт" з Міхалова, „Лучына" з Беластока і „Асенні ліст" з Гарадка.

Ужо сцямнела, а над вадой і па прыгожай ваколіцы ўзлескаў плылі ды плылі мілагучныя беларускія песні.

Гарадок гуляў...

Янка Целушэцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Зімовы палац



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Самы вялікі ў Пецярбургу Ісакаўскі сабор

У Расіі

Юбілейны Санкт-Пецярбург

Чарговым горадам, які мы наведалі, быў Санкт-Пецярбург. Вясной турыстаў прыцягваюць белыя ночы. У канцы ліпеня цямнець пачынала таксама вельмі позна. Яшчэ пасля адзінаццатай гадзіны ўначы рэстараны былі поўныя турыстаў і жыхароў горада з дзяцьмі. Працавалі кругласутачныя магазіны з прадуктамі харчавання. Турысты цікавіліся разваднымі мастамі, якія зводзіліся ў дзве гадзіны ночы ды начнымі канцэртамі з нагоды 300-годдзя горада.

Перад юбілейнымі святкаваннямі цэнтр горада стаў вялікай рамонтнай пляцоўкай. Адрамантаваны быў Казанскі сабор, у якім адбываюцца богаслужэнні. Звонку захаваў ён даўні выгляд, але ўсярэдзіне амаль усё аднавілі. У храме многа даўніх ікон, а сярод іх вельмі старая Казанская ікона Божай Маці. Са Святой зямлі прывезлі часціцу з Гасподняга крыжа і часціцу каменя з Гасподняга гроба, да якіх прыкладваюцца вернікі. Сабор у цэнтры горада наведваюць турысты розных нацыянальнасцей і веравызнанняў. Дзіцячы хор Казанскага сабора выступаў на Міжнародным фестывалі царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы. Харысты станоўча ацэньваюць нашу краіну на падставе таго, што ўбачылі на Беласточчыне.

Адбудова Казанскага сабора, аднаго з самых вялікіх у Расіі, адбывалася за дзяржаўныя сродкі і складчыны праваслаўных вернікаў. Толькі за дзяржбюджэтныя сродкі адбудоўваўся самы вялікі ў Пецярбургу Ісакаўскі сабор. У храме многа велізарных ікон, якія прыцягваюць увагу турыстаў. Сабор працуе як звычайны музей і толькі на ўсяночнае богаслужэнне ў суботу і на Літургію ў нядзелю праваслаўныя вернікі могуць уваходзіць дармова. Цэны білетаў грамадзянам Расійскай Федэрацыі на некалькі разоў ніжэйшыя чым замежнікам. Турысты па лесвіцах могуць дабірацца на званіцу, каб адтуль паглядзець на Пецярбург. Пазіцыяй гарадскіх улад незадаволены праваслаўныя вернікі, якія хацелі б атрымаць назад царкву забраную камуністычнымі ўладамі. Ісакаўскі сабор не з'яўляецца выключэннем. У Пецярбургу яшчэ многа будынкаў і храмаў, якія да рэвалюцыі былі ўласнасцю Рускай праваслаўнай царквы і якія да гэтай пары не вернуты законнаму ўласніку.

Дзяржаўнай застаецца царская маёмасць. Многа сродкаў улады выдаткавалі на рамонт Зімовага палаца, збудаванага ў XVIII стагоддзі. Велізарны чатырохпавярховы будынак састаўляе плошчу больш за 22 тысячы квадратных метраў. Вялікую яго частку займае Эрмітаж, у якім знаходзіцца каля 2,7 мільёнаў музейных адзінак захавання — карцін і скульптур рускіх ды замежных мастакоў. Перад Зімовым палацам знаходзіцца вялікая плошча з Аляксандраўскай калонай. На плошчы праводзяцца дзяржаўныя святкаванні і ваенныя парады.

У чацвёртым па колькасці жыхароў горадзе Еўропы (пасля Лондана, Масквы і Парыжа) пастаянна жыве каля 4,7 мільёна людзей. У Пецярбургу пражывае 152 тысячы украінцаў, 106 тысяч яўрэяў, 93 тысячы беларусаў, 44 тысячы татараў і па 12 тысяч армян і азербайджанцаў. Многа прадстаўнікоў нярускіх нацыянальнасцей прыбыло ў Пецярбург пасля рэвалюцыі, а таксама пасля блакады горада ў час апошняй сусветнай вайны.

Для лепшага знаёмства з горадам рашыліся мы паплыць лодкай па каналах і рацэ Няве. З вады добра відаць Петрапаўлаўскую крэпасць з Петрапаўлаўскім саборам і вядомай турмой. Непадалёк ад крэпасці стаіць крэйсер „Аўрора". У час абстрэлу Зімовага палаца служыў на ім Якуб Мартынюк з Новага Беразова.

Замежных турыстаў можна сустрэць на цэнтральнай вуліцы горада — Неўскім праспекце. Знаходзяцца там самыя дарагія ў горадзе магазіны, якія сваімі цэнамі перабіваюць маскоўскіх і варшаўскіх купцоў. Паслугі таксістаў там таксама дарагія і таму пецярбуржцы масава карыстаюцца метро, тралейбусным і аўтобусным транспартам. Турыстам прапануюцца рэстараны на параходах прычаленых да набярэжнай Нявы і дарагія гатэлі. Мы затрымаліся на прыватнай кватэры ў знаёмых.

Аляксей Мароз

Ну, добра, мы заплацім, але, пэўна, пахаваюць яе ў мяшку.

Горкая Ягадка

А і ксёндз не возьмецца праводзіць яе за „Bóg zapłać". А хто заплаціць за беспрацоўную саракагадовую самотную жанчыну, без сваякоў, дзетдомаўку, без свае хаты? Праўда, у Ядвігі Канопкі быў муж, ды кінуў яе дваццаць гадоў таму для іншай, якая нарадзіла яму двое дзяцей. І старэнькі дзядзька, цяпер пражываючы ў Доме сацыяльнай апекі ў Беластоку па вуліцы Свярковай. Прыёмныя бацькі памерлі, калі ёй было восем гадоў. І на іхнюю магілку завяла была Ягадка сваіх знаёмых, спявачак з пенсіянерскага клуба — пані Веру і Гражыну. Ды забыліся, дзе тая магілка, якую наведвала адна толькі асоба. А так, вось, пахавалі б яе там, не трэба было б шукаць месца на Гарадскім могільніку, у левым куце, дзе ніхто нікому не спадзяецца ставіць помнік. Там пад зарослымі травой нізенькімі копчыкамі, дзенідзе абкладзенымі каменнем ці абгароджанымі плоцікамі, пакояцца ў большасці маладыя людзі, мужчыны. Каму сорак у дзень смерці, каму трыццаць. Рэдка сустрэнеш магілку пяцідзесяцігодка. Зараз направа — гранітныя і мармуровыя помнікі „горада памерлых", па прынцыпе „як жыў, так і жывеш". Некаторыя яшчэ жывуць, а ўзвялі сабе грабніцы. Апякуюцца імі, садзяць кветкі, мыюць камень перад Дзядамі, з любасцю глядзяць на свае прозвішчы ды імёны ды дату нараджэння і пустое месца збоку, за літарамі „памёр". А тут, наводшыбе, ціха і роўна. І праводзяць памерлых адна-дзве асобы, або і ніхто. Не заводзячы іх у экуменічную капліцу на пачатку могільніка, без адпявання. А ці не ўсё адно ім там, у сырой зямлі, ляжаць, у фанернай таннай труне, аплачанай *панствам*, ці нават у тым чорным фольгавым мяшку?..

Пра той мяшок успомніла пані з апекі цырульніцы Барбары, у якой Ягадка пільнавала была дзяцей. Бо хто мае за труну ды пахаванне заплаціць? Можа, той малады мужчына, які наехаў на азначаным паясамі месцы на жанчыну на вуліцы Ліпавай у Беластоку, насупраць „Ратушавай" крамы? Паліцыя, у якую пазванілі з апекі, была *niegrzeczna* і параіла ўсё аплаціць, а пасля судова спагнаць з даўжніка грошы за пахаванне. Праверыўшы, што ў спадарыні Канопкі сапраўды няма ні сваякоў, ні маёмасці па сабе ніякай не пакінула, сталі пасля тыдня ад яе смерці афармляць справу. Барбара прынесла адзенне для нябожчыцы. Паведамілі гаспадарам, у якіх апошні час наймала пакой, суседзям. Найбольш перажываў самотны дзедка, пан Ян, знаёмы пансіянерак, якія ў апошні час пасябравалі з Ядвігай. Наведалі былі яны яго нядаўна разам, дзедка рашыў аддаць Ягадцы паліто нябожчыцы жонкі, цёплае, з каціным каўнерыкам. Ягадка апранула паліто, прытуліла твар да пушыстага каўняра, заплакала.

— Дзетка, што ты плачаш! — усхваляваўся дзядуля.

— А так... Такі мяккі... Прытулілася... Цёплы... Ніхто мне нічога не падарыў, а вы такі добры...

— Божа мой, дзіцятка, будзь ты мне ўнучкай! Жыві ў мяне, дарагая, у мяне пакой ёсць для цябе. Паможаш крыху, бо мне аднаму цяжка.

Дзядуля прапісаў Ягадку ў сябе. Ачысціла, падрамантавала шчаслівая кабета хату свайго прыёмнага дзеда. „Дзядуленька вы мой! Бацькі мае памерлі родныя, памерлі і прыёмныя, а дзедкі ні бабкі сваіх я і не мела, і не ведала..." А ён і не ведаў, як ёй дагадзіць. А ж у Ягады сапраўды нічога не было. Даў ёй сто злотых, каб купіла нейкія боты. І па тыя боты і пайшла тады ў „Цэнтраль", і трапіла пад машыну... Тыдзень змагаліся лекары ў шпіталі за яе жыццё. Не памагла аперацыя чэрапа. Ядвіга Канопка, беспрацоўная, да нядаўна бяздомная, памерла не апрытомнеўшы.

Заняўся цырымоніяй пахавальны дом па вуліцы Навагрудскай. І ў фанернай труне павезлі, не адкрываючы яе светлага, добрага маладога твару, па крутых алейках гарадскога могільніка на месца спачыну, туды, куды адпраўляюць тых, у каго няма ўжо нікога і нічога на гэтай зямлі. Ксёндз у больш за дзесяць хвілін адпеў яе (заплацілі яму за святое слова па палове Барбара і дзядуля), а на свежым копчыку леглі кветкі. Не адна ці дзве асобы праводзілі Ядвігу, а больш за трыццаць. Каталікі, праваслаўныя, адвентысты. І копчык выглядаў багата — у кветках, вянках, са свечкамі ды лямпачкамі. На крыжы красаваўся вялікі вянок. „Глядзі, як вясельны!" — ацанілі пенсіянеркі. Белыя і ружовыя лілеі. І надпіс на шырокай стужцы: „Унучцы — дзедка". Дзедка меў унучку адзін тыдзень.

Міра Лукша

Родам з Беласточчыны

Па слядах Антона Неманцэвіча

Пасёлак Альбярцін Слонімскага раёна (цяпер мікрараён Слоніма) узнік у першай палове XIX стагоддзя, як сядзіба маршалка шляхты Слонімскага павета В. Пуслоўскага (1762-1833). У 1924 годзе тут быў адчынены манастыр айцоў езуітаў усходняга абраду і навіцыят.

У пачатку верасня 1929 года ў Альбярцін з Рыма прыязджае Антон Неманцэвіч, які пры Усходнім Інстытуце вывучаў усходняе багаслоўе і абараніў доктарскую дысертацыю на тэму „Бальшавіцкае заканадаўства ў Расіі адносна рэлігійнага і маральнага ўзгадавання дзяцей у параўнанні да божага права, натуральнага і аб'ектыўнага".

Антон Неманцэвіч — асоба вельмі цікавая, амаль не даследаваны яго жыццёвы, рэлігійны і творчы шлях. Наш зямляк у 30-40-х гадах мінулага стагоддзя займаў кіруючае становішча ў Беларускай грэка-каталіцкай (уніяцкай) царкве, быў першым беларускім экзархам і да таго ж шчырым патрыётам Беларусі. Найлепшым на сённяшні дзень з'яўляецца артыкул пра Антона Неманцэвіча, які напісаў айцец Леў Гарошка. Ён быў апублікаваны ў парыжскім беларускім часопісе „Божым шляхам" (1956 г., № 70-73).

Нарадзіўся Антон Неманцэвіч у 1893 годзе каля Саколкі на Беласточчыне. Скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю і Петраградскую каталіцкую духоўную акадэмію. Калі вучыўся ў акадэміі, прымаў актыўны ўдзел у рабоце Беларускага гуртка, вывучаў і цікавіўся гісторыяй Беларусі, асабліва гісторыяй уніяцкай царквы.

Пасля заканчэння духоўнай акадэміі ў 1918 годзе Антон Неманцэвіч працуе



вікарыем парафіяльнага касцёла святой Кацярыны ў Петраградзе. За пратэст супраць арышту беларускага біскупа Цепляка, айца Неманцэвіча на некалькі месяцаў арыштоўваюць і саджаюць у турму, а ў 1923 годзе ў турму ён трапляе паўторна. Яго вызваляюць у 1925 годзе ў выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Выйшаўшы на волю, наш зямляк едзе ў Рым, дзе вывучае тэалогію. З Рыма ў пачатку восені 1929 года ён прыязджае ў Альбярцін на Слонімшчыну.

Тут, у Альбярціне, айцец Неманцэвіч прымае ўсходні грэка-каталіцкі абрад і становіцца настаяцелем грэка-каталіцкай царквы. Дарэчы, грэка-каталіцкая (езуіцкая) група ў Альбярціне мела на мэце адрадзіць у форме гэтага абраду царкоўную унію. Патронамі місіі былі папа рымскі Пій XI і віленскі архібіскуп мітрапаліт Ю. Матулевіч, пасля Р. Ялбжыкоўскі. Непасрэдна групай у Альбярціне кіраваў езуіцкі правінцыял з Польшчы Я. Урбан. Езуітам быў выдзелены будынак, дзе раней знаходзілася дырэкцыя Альбярцінскай суконнай і кардонна-папяровай фабрык. Былы іх уладальнік граф Пуслоўскі ахвяраваў місіі вялікія сродкі.

У Альбярціне айцец Антон Неманцэвіч выдае часопіс „Да Злучэньня". Першы нумар яго выйшаў у студзені 1932 года. Шмат для часопіса артыкулаў пісаў сам рэдактар, які падпісваўся пад сваім прозвішчам і пад псеўданімам Злучэнец. Акрамя свайго выдання, Антон Неманцэвіч пісаў і ў Беларускі каляндар, які выдаваўся ў Вільні. Паспяваў ён працаваць яшчэ над рознымі рэфератамі і выступленнямі па тэме уніі. Пра адзін факт на гэты конт згадвае Леў Гарошка ў часопісе „Божым шляхам" (1956, № 70-73, с. 51): „Летам 1932 года адбыўся ў Пінску трэці Унійны зьезд, на які быў запрошаны а. Антон у характары прэлегэнта, ён меў чытаць па-беларуску рэфэрат аб вунійнай працы. За пару дзён да адкрыцьця зьезду, калі ўжо рэфэрат даўно быў гатовы, яму было загадана пераклумачыць рэфэрат на польскую мову. Гэтым фактам а. Антон быў так абураны, што больш ня ўдзельнічаў на ніводнай пазьнейшай вунійнай канфэрэнцыі". У сярэдзіне 1933 года Антона Неманцэвіча з Альбярціна пераводзяць у Сынковічы (побач са Слонімам, 12 км) на пасаду параха. А праз год яго адпраўляюць у Дубна на выкладчыцкую пасаду ў семінарыю. Па-ранейшаму Неманцэвіч рэдагуе часопіс „Да Злучэньня", але ў 1938 годзе ён спыняе сваё існаванне. Прычынай закрыцця выдання стала тое, што часопіс выходзіў па-беларуску. Тым не менш, у пачатку 1939 года Антон Неманцэвіч у Варшаве арганізоўвае выпуск новага часопіса „Злучэньне".

У верасні 1939 года Заходняя Беларусь уваходзіць у склад БССР. Шмат усходнеі-каталіцкіх парафій было ліквідавана, але Антон Неманцэвіч наладжвае сувязі з Львоўскім украінскім мітрапалітам Андрэем Шаптыцкім. Мітрапаліт Шаптыцкі ў 1940 годзе стварае чатыры ўсходне-каталіцкія экзархаты, сярод іх Беларускі Экзархат на чале з экзархам айцом Антонам Неманцэвічам. Дакументы былі дасланыя ў Рым і зацверджаны папаю Піем XII 22 кастрычніка 1942 года.

Наш зямляк зноў вяртаецца ў Альбярцін і пашырае думку, што нацыянальнай беларускай рэлігіяй павінна быць унія, бо так было ў мінулым. Ён шчыра сябруе з беларускімі дзеячамі літаратуры, мастацтва, краязнаўства, з беларускімі арганізацыямі. „Але падчас нямецкай акупацыі ў Слоніме, — як піша Леў Гарошка, — знаходзіўся моцны нелегальны цэнтр расійскіх арганізацый «Трудового союза» і «Братства русской правды». Гэтыя арганізацыі нароўні з праваслаўнымі епіскапамі ў недалёкіх Жыровічах лічылі Беларускі Экзархат вялікай перашкодай для свае дзейнасці і не шкадавалі ніякіх высілкаў, каб яго знішчыць. Вельмі шмат інтрыг супраць экзарха рабіў актыўны сябра вышэйназваных расійскіх арганізацый і адначасна ўрадавец нямецкага гестапа — Ушпік. Ягоныя інтрыгі выкарыстоўвалі епіскапы з Жыровічаў, каб рабіць новыя даносы. Варта ўспомніць, што з аднаго даносу, на якім фігуравалі подпісы двух епіскапаў, якія былі ў Жыровічах, адзін урадавец гестапа зрабіў копію і пераслаў яе на перахаванне ў адпаведную ўстанову. Інтрыгі і даносы моцна паралізавалі дзейнасць а. Антона. Трэба ведаць, што ў тым часе распачаліся на Слонімшчыне расстрэлы каталіцкага духавенства".

Але Антон Неманцэвіч не здаваўся, а наадварот, у пачатку 1942 года на Слонімшчыне заснаваў яшчэ Апостальства Малітвы за Беларусь. Раз у месяц святары і прыхаджане маліліся за сваю Бацькаўшчыну.

І ўсё ж у жніўні 1942 года гестапаўцы прыехалі ў Альбярцін, увайшлі ў манастыр і арыштавалі Антона Неманцэвіча. Са Слоніма яго адправілі ў Мінск, дзе праз паўгода памёр ад тыфу. Па іншых звестках, айцец Неманцэвіч быў закатаваны ў падзямеллях гестапа. А Янка Трацяк у *Энцыклапедыі гісторыі Беларусі* (Мінск 1999, т. 5, с. 320) сцвярджае, што Неманцэвіч памёр у турме ў Берліне.

Пасля таго, як не стала ў Альбярціне Антона Неманцэвіча, уніяцкія манахі вельмі хутка пакінулі Слонімшчыну і выехалі ў Львоў.

Сяргей Чыгрын

Збіраюцца матэрыялы пра Гайнаўку

Гарадская публічная бібліятэка ў Гайнаўцы збірае і захоўвае старыя дакументы, выданні, фотаздымкі ды іншыя матэрыялы па гісторыі Гайнаўкі і ваколіцы. Бібліятэка звяртаецца з просьбай да ўсіх, хто мае такія матэрыялы, каб наведалі бібліятэку асабіста або паведамілі пра свае зборы пісьмова (ГПБ, 17-200 Гайнаўка, вул. 3 Мая 45) або па тэлефоне.

Усе дакументы гістарычнага характару пра Гайнаўку і наваколле будуць добра служыць вучням пачатковых школ, гімназістам, студэнтам ды даследчыкам. Імі будуць карыстацца журналісты і рэдактары рэгіянальных газет ды часопісаў, а таксама выдаўцы папулярна-навуковых часопісаў.

Задума добрая і дзеянне карыснае. Варта ж ведаць гісторыю блізкай сэрцу Гайнаўшчыны. Калі застанецца яна ў памяці тутэйшых жыхароў, яны не згубяць сваёй тоеснасці.

(яц)

Малітва за салдат

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Сярод савецкіх помнікаў — праваслаўны і каталіцкі крыжы

Ужо традыцыяй стала, што ў дзень Усячэння галавы св. Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы хрэсны ход ідзе з царквы на могілкі. Пакояцца там астанкі савецкіх салдат, загінуўшых пры вызваленні Гайнаўшчыны з-пад гітлераўскай акупацыі. У гэты дзень у праваслаўных цэрквах памінаюцца імёны жаўнераў загінуўшых на полі бою. На Гайнаўшчыне свяшчэннікі ходзяць па могілках, моляцца за памерлых і асвячаюць магілы.

11 верасня ва Усясвяцкай царкве на могілках у Гайнаўцы служылася Літургія з удзелам святароў трох гайнаўскіх праваслаўных прыходаў. Прыехалі таксама блізкія салдат, якія пакояцца на могілках. У час паніхіды сабраныя маліліся за загінуўшых жаўнераў. Пасля вячэрняга богаслужэння, у час якога чытаўся акафіст да святога Іаана Хрысціцеля, сабраныя маліліся каля магілаў святароў, а затым пайшлі хрэсным ходам на магілы савецкіх салдат. Пасля малітваў за загінуўшых на Гайнаўшчыне і ва ўсім свеце, святары асвяцілі салдацкія магілы. Каля помніка, пастаўленага некалькі дзесяткаў гадоў таму, нядаўна ўстанавілі два крыжы (праваслаўны і каталіцкі) і гэтым асвяцілі месца пахавання. Над брацкімі магіламі салдат знаходзяцца помнікі з савецкімі зоркамі. На мемарыяльных дошках найчасцей пададзена адно прозвішча і колькасць безыменных воінаў. Разам на могілках пакояцца 1 223 салдаты, эксгумаваныя з розных мясцін Гайнаўшчыны.

Могілкі ўражваюць чысцінёю і парадкам. Дарожкі паміж помнікамі прыбраныя. Могільнікам апякуюцца вучні і жыхары Гайнаўкі. Раней дзеля гэтага прыязджалі сямейнікі загінуўшых салдат. Калісьці Падставовай школе н-р 2 у Гайнаўцы было прысвоена імя савецкага салдата Аляксея Фларэнкі, але зараз патрон школы памяняўся. Гэта не перашкодзіла ў захаванні памяці сярод людзей, якія з прыхільнасцю і адкрытым сэрцам ставяцца да савецкіх салдат, якія аддалі жыццё за вызваленне Гайнаўшчыны. Прыносяць яны на могілкі знічы і кветкі. У дзень Усячэння галавы Іаана Хрысціцеля таксама гарэлі лямпачкі ад гайнавян.

Аляксей Мароз

Тэрыторыя пад асаблівай аховай

Падляшскія ваяводскія ўлады стараюцца, каб звыш чвэрць рэгіёна знайшлося ў праграме „Natura 2000”, якую будзе дафінансоўваць Еўрасаюз. Справа ў звышдзяржаўнай, агульнаеўрапейскай ахове фауны і флоры, у яе ліку дзікіх звяроў і унікальных раслін. Мэтай гэтай праграмы — стварэнне суцэльнай сеткі на абшары Еўрапейскай супольнасці, якую называюць Еўрапейскай экалагічнай сеткай. Прадстаўнікі ўрадавай і самаўрадавай адміністрацыі, Дзяржаўных лясоў, навуковых устаноў і экалагічных няўрадавых арганізацый вызначылі ўжо абшары, якія маглі б трапіць пад гэтую праграму. Складаюць яны 26,22% усёй плошчы ваяводства — у значнай частцы пражывае на ёй беларуская меншасць. Гэта ўсе нацыянальныя і ландшафтныя паркі, 68 з ліку 88 запаведнікаў прыроды і частка тэрыторыі ландшафту пад аховай. У рэкамендацыі, перададзенай падляшскім маршалкам міністру аховы асяроддзя, намякаецца выключыць з гэтага абшару г.зв. калідоры транспартнай інфраструктуры краёвага і міжнароднага значэння ды электраэнергетычныя лініі высокага напружання, якія павінны пралягаць у гэтых калідорах. У выпадку, калі такога выключэння не будзе, узнікнуць цяжкасці ў рэалізацыі гэтых намераў, напрыклад, мадэрнізацыі шляху „Via Baltica” на адрэзку Бебжанскага нацыянальнага парку. У выпадку браку такога запісу пасля ўваходу ў праграму „Natura 2000” інвестыцыі могуць ніколі не ажыццяўляцца, а напэўна адтэрмінуюцца.

— Яшчэ зарана гаварыць аб коштах і карысцях, якія прынясе праграма „Natura 2000”, — сказаў дырэктар дэпартамента інфраструктуры, гаспадаркі і аховы асяроддзя Падляшскай маршалкоўскай управы Яраслаў Ідзькоўскі. — Толькі пасля вызначэння канчатковага кшталту сеткі „Natura 2000” ва ўсёй Польшчы ў выніку разнастайных кансультацый ды перадачы праекта Еўрапейскай камісіі, праўдападобна, пачнецца праца над рамкавай праграмай ажыццяўлення сеткі.

Тым часам сетка „Natura 2000” у ЕС яшчэ не існуе. Уступна прынята, што ўключаныя ў яе тэрыторыі павінны ахопліваць 5% плошчы краіны. Аднак ужо ў некаторых краінах-членах тыя паказчыкі перасягнуты. Прыкладова, у сетку будзе ўключана аж 15% тэрыторыі Даніі, Грэцыі, Італіі ці Іспаніі. Працягваецца хадайніцтва ахапіць праграмай у падляшскім рэгіёне тэрыторыю м.інш. Белавежскай пушчы, Верхняй і Ніжняй Нарвы, Ніжняга Буга і Даліны Бебжы. Можна, аднак, спадзявацца, што паўплывае гэта на сур’ёзныя інвестыцыйныя цяжкасці на гэтых абшарах, з другога ж боку — будзе захаваны першабытны характар гэтай зямлі. Пытанне, ці гэтак павінна выглядаць жыццё жыхароў гэтай зямлі ў цывілізацыйна абмежаваных умовах пасля ўваходу ў праграму „Natura 2000”, яшчэ ніхто і не ставіць. (холм)

Выбары судовых засядацеляў

10 верасня г.г. адбылася чарговая сесія Рады гміны ў Чаромсе, прысвечаная актуальным справам гміны і выбарам народных засядацеляў. Кандыдатаў прапанавалі ў асноўным прафсаюзныя арганізацыі і жыхары гміны. У аб’ёме права працы было прапанаваных пяць кандыдатаў. У час галасавання засядацелямі былі абраны: Галена Зазанюк з Гміннай управы і Міраслаў Данілюк з Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу.

Для разгляду крымінальных і сямейных спраў з сямі кандыдатаў былі выбраны Данута Генавефа Раманюк і Іаланта Галімская. Гэтыя кандыдаткі былі вылучаны ад жыхароў пасёлка. Радныя заслухалі яшчэ інфармацыю аб дзейнасці Гміннага прадпрыемства камунальнай гаспадаркі і Асяродка сацыяльнай апекі за першае паўгоддзе. Дырэктар ГОК Тамара Кердалевіч паінфармавала дэпутатаў, што 8 лістапада калектыў „Чарамшына” будзе адзначаць дзесяцігоддзе культурнай дзейнасці і прасіла прызначыць грашовую падтрымку на гэтую мэту.

Кіраўнік павятовага бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы Мікола Яноўскі прадставіў інфармацыю наконт даплат да большых за 1 гектар гаспадарак. Рада прыняла некалькі рашэнняў, якія адносяцца да змен у бюджэце гміны наконт прынцыпаў куплі і продажу грунтаў ды будынкаў, а таксама іх арэнды. Радныя вырашылі, што за падключэнне да санітарнага калектара трэба будзе заплаціць 1 800 зл.

Уладзімір Сідарук

Дарогі...

У час народнай дэмакратыі, у 1970-я і на пачатку 80-х гадоў, Нарваўская гміна славілася грамадскімі пачынамі. Па ініцыятыве Гміннага камітэта ПАРП і ЗСЛ ды гмінных улад будаваліся дарогі. Адна такая дарога была пабудавана, каб спалучыць Нарваўскую гміну з Міхалоўскай, праз вёскі Адрынкі і Новую Волю. Другая — з Трасцянкі ў Пухлы. Бывала, выязджаюць з кожнай вёскі людзі на грамадскі пачын, шчыра працуюць, а праўленне ГС у Нарве давязе ім халодныя напоі, піва, хлеб і каўбасы. Людзі былі задаволены, што іхняя праца дае карысць дзяржаве, а ім самім будзе лепшае спалучэнне са светам.

Цяпер, пры рыначнай гаспадарцы, людзі ізноў стараюцца, каб на тых жа дарогах пакласці асфальтнае палатно, але, на жаль, на гэта заўсёды бракуе грошай. Прыкладам з’яўляецца гравійная дарога з Трасцянкі ў Бялкі, дзе толькі асфальтуюць 1 200-метровы адрэзак дарогі, а на 2 300 метраў няма грошай. Па гэтых дарогах ездзяць аўтобусы ПКС ды школьныя, а прывесці іх у парадак няма каму.

Мікалай Лук’янюк

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Удзельнікі сустрэчы ў „Краіне шчаслівасці” (у цэнтры Славамір Галёнка, у шортах)

У Краіне шчаслівасці

Славамір Галёнка з’яўляецца стваральнікам „Краіны шчаслівасці — Слаўконія”, якая знаходзіцца каля Скупава. 29 жніўня арганізаваў ён у сваёй краіне сустрэчу з самаўрадаўцамі і прадстаўнікамі няўрадавых арганізацый. Запрапанаваў ён сабраным супольную дзейнасць у карысць рэгіёна.

— У мяне ёсць ідэя наконт развіцця рэгіёна, але я хацеў, каб усе выказаліся на гэтую тэму. Важна, каб дайсці да розных крыніц і здабыць сродкі, — заявіў Славамір Галёнка, ураджэнец Гайнаўкі, які працуе сцэнографам у варшаўскім тэлебачанні. Нядаўна купіў ён участак зямлі сярод пушчанскіх дрэў і пачаў будаваць у ім драўляны дом. Месца назваў „Краінай шчаслівасці — Слаўконіяй”. Выкарыстоўваючы лясны ўчастак, хоча разгарнуць грамадскую дзейнасць. У бліжэйшы час плануе арганізаваць мастацкі пленэр, спалучаны з заняткамі для мясцовых дзяцей. У будучыні намерваецца арганізаваць у Нараўцы фэст і канцэрты. Плануе наладзіць супрацоўніцтва з беларускімі і ўкраінскімі арганізацыямі, паказваць турыстам мясцовыя традыцыі і культуру. Дзеля гэтага ў яго намер арганізаваць чарговае спатканне ў гмінным будынку ў Нараўцы. Прысутны на спатканні войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч зацікавіўся прапановамі, якія могуць ажыццяўляцца ў яго гміне. Запрашэннем не пакарысталіся самаўрадаўцы з іншых гмін. Прыбылі затое журналісты і мастакі. Хаця сустрэча была спробай інтэграцыі мясцовага асяроддзя, не прывяла да канкрэтных вырашэнняў. Будуць яны прымацца ў верасні.

Аляксей Мароз

Нараўчанскія пенсіянеры

Нараўчанская раённая арганізацыя Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў — адна з найактыўнейшых у Падляшскім ваяводстве. Цяпер старшынствуе ёй Ядвіга Карпюк з Нараўкі. Працуюць гурткі пенсіянераў у Старым і Новым Ляўкове. Арганізацыя налічвае больш за 200 членаў.

Сёлета праўленне арганізацыі людзей „трэцяга ўзросту” арганізавала танцавальныя вечарыны з конкурсамі і іншымі атракцыёнамі, а таксама экскурсіі, між іншым, у Тыкоцін і Асавец. Чарговае мерапрыемства — святкаванне Дня сеніёра — адбудзецца ў кастрычніку.

2 мая г.г. у Гайнаўцы наладзілі раённы агляд песенных калектываў сеніёраў. На ім добра выступілі стараляўкоўскія „Цаглінкі” і яны прайшлі адбор на ваяводскі агляд.

Варта дадаць, што пенсіянерам шмат дапамагае войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч. У Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы пенсіянеры маюць сваё бюро, а ў кавярні ГАК ладзяць забаўляльныя мерапрыемствы. Часовае карыстанне з памяшкання прыходзіцца ім бясплатна. (яц)

Музей у Нараўцы

У Нараўцы будзе Рэгіянальны этнаграфічны міні-музей (РЭМ). Будзе ён знаходзіцца ў прыгожым драўляным будынку былога дзіцячага садка, побач Гміннага асяродка культуры, па вул. Новай. Будучаму музею ўжо сабралі некаторыя экспанаты, у іх ліку старыя сельскагаспадарчыя прылады ды прадметы хатняга ўжытку.

У РЭМ паказвацца будуць, між іншым, гліняныя збаны і гаршкі, г.зв. сівакі, драўляныя маслабойкі, кубкі і лыжкі, калаўроткі, жорны, цапы, сярпы, колішнія пакрывалы і радзюжкі, дываны, а таксама вышываныя ручнікі і кашулі.

— На музейным панадворку стане манеж, мабыць сячкарня, а можа тое і тое, — кажа войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч. — Як мае быць у музеі, падкажуць нам вядомы мастак Віктар Кабац ды разьбяр Уладзімір Мусько з Гайнаўкі.

У музеі будуць праводзіцца ўрокі гісторыі ды заняткі па этнаграфіі. Бузей будзе даступны турыстам. (яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дзе ж такі краявід? Адказ: Беласточчына, зямелька родная.

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Малады матрос паплыў у свой першы рэйс і ўвесь снежань меў правесці здалёк ад сям'і. Перад Калядамі павесіў у сваёй каюце жаночы купальны касцюм і прычапіў да яго картачку: „Дарагі Дзед Мароз! У гэтым годзе прашу ў цябе толькі адзін падарунак: калі можаш, дык запоўні мне гэты касцюм нечым канкрэтным”.

* * *

— Чаму стол не мае малых столікаў?

— Бо мае шуфляду паміж нагамі.

* * *

Пасяджэнне Акадэміі навук СССР. Вядучы генетык Трахім Лысенка зачытаў рэферат аб спадчыннасці атрыманых прымет. Пачынаецца дыскусія, устае адзін прафесар і пытае дакладчыка:

— Вы даказваеце, што калі б адрэзаць карове вуха і пасля абрэзваць яго ўсім яе наследніцам на працягу многіх пакаленняў, то пасля сталі б нараджацца каровы без вушэй?

— Безумоўна!

— А як вы растлумачыце той факт, што ўвесь час родзяцца дзявіцы?

* * *

Жонка да мужа:

— Быў сёння ў дырэктара?

— Быў.

— Грымнуў кулаком у стол, так як мне абяцаў?

— Грымнуў.

— І што на тое дырэктар?

— Ён сёння быў у камандзіроўцы.

* * *

Гінеколаг апытвае хворую:

— Ці вы замужам?

— Не.

— Маеце прыяцеля?

— Не.

— Гэта цікава, бо вы цяжарная.

— Няма тут нічога дзіўнага, бо маю дырэктара.

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Мяне смешаць вусы нашага дырэктара.

— Мяне таксама: вельмі казычуць.

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне, прыказку.

1. спрынт, марафон або галоп = 4 __ 27 __ 8 __;
2. рэлігія = 20 __ 21 __ 5 __ 6 __;
3. агародная расліна сямейства гарбузовых = 2 __ 14 __ 22 __ 25 __;
4. прыпынак у дарозе для кармлення жывёлы = 11 __ 9 __ 18 __ 12 __ 26 __;
5. невялікая стракатая птушка атрада вераб'іных (*Parus*) = 10 __ 16 __ 15 __ 17 __ 29 __ 30 __;
6. колькасць малака надоеная за адзін раз = 1 __ 13 __ 3 __ 7 __;
7. месца заслоненае ад святла = 28 __ 19 __ 24 __ 23 __;

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 32 нумара

Адны пануюць, другія гаруюць.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Адзін пад экранам

Застанецца мужык без жонкі дома, дык, кажу вам праўду, як тая сірата. Прывыкаеш гадамі, што ў некаторых справах за цябе думае іншая асоба. А потым не ведаеш, куды нос сунуць, каб аформіць самую простую з простых справу. Нават я, які, як кажа мая Агата, зусім з глуздам мужык, значыць, не трэба доўга такому дзяўбці ў галаву, каб зразумеў, дзе што ляжыць ці стаіць, у час, калі жонка паехала сабе за мяжу, адчуваю сябе як дзіцё ў імгле ці сляпое шчаня. Вядома, пабыўшы адзін, не такі ўжо і распушчаны вечнай жончынай апекай, да таго не такі зусім і разява, дык неяк спраўляюся. Тым больш, што ёсць у мяне і сябры, і тэлебачанне, і газеты.

Ай, з гэтым усім! Папсаваўся ў мяне наш новы тэлевізар. Пакуль нагрэецца, можа прайсці і паўгадзіны. Праўда, больш я яго трактаваў, як Агату — прыйду ў хату, а штосьці ўсё балбоча, такі хатні фальклор, каб не адчуваць самоты. А тэлевізар добры, харошы — і тэлегазета ў ім, і гадзіннік. А сканаў — бы прапаў дарагі чалавек. Палез я ў склеп, перапрасіўся са старой „Юнасцю”. Чорнабелай, але цэлай. Уключыў, зашыпела, забурчэла, і паказаўся вобраз. Робіць! Я не самотны, тэлевізар у мяне!..

Пабег я рыхтаваць што паесці, а з пакоя далятае балбатня першай праграмы. Пасля мая старая „Юнасць” раптам перамяніла канал і стала перадаваць „Польсат”. Ну, падумаў я, хай будзе! Тэхніка старая, як і я сам, дык можна сабе дазволіць на эксперыменты. Хай паскача! Прынёс я ў пакой гарачую яечню з памідорамі, рассеўся. Добра — тэлевізар блізка стаіць, акуляраў не трэба надзяваць. Паеў, выпіў гарбату, на сон мяне стала марыць. Занёс я талерку на кухню, кінуў у ракавіну, не мыўшы, і вярнуўся да свайго выбаўцы ад суму. Так і пакаціўся на канапу. Паправіў падушку — і ляжыш, і глядзіш. Паставіў на тэлевізар электронны гадзіннік, каб далёка не глядзець, бо ж у „Юнасці” няма гадзінніка.

— Буду мець і тэлегазету, — схамянуўся я спрасонку, адарваў кавалак учарашняга „Кур'ера параннага” і прыклеіў на шарыку скамечанага хлеба да тэлевізара.

— Чаго ўзіраешся? — буркнуў я да Гарэшкі, якая цярпліва чакала, каб я яе правёў у кусты. Сучка ўхапіла рэшту газеты і стала матлашыць на падлозе. — Іду спаць, пачакай!

Спаць доўга не спаў, бо ў дзверы пазваніў Міколка. Гарэшка кульнулася яму пад ногі і сама рванулася на вуліцу, так яе наперла. Мяне не надта тое абышло. Ну, што ж, трапіць у рукі стражнікаў, хай сама тлумачыцца, што без намордніка ды без гаспадара бегае. Гэтак і выказаўся я перад Здунюком.

— Дасць табе Агата за тое, што Гарэшку згубіў!

— Вернецца, вернецца, яшчэ і на ліфце прыедзе, бо не схочацца цягнуцца ёй на шосты паверх... А трапіць у прытулак, дык папрашу МакХолада, хай па яе едзе забірае, яму там усе знаёмыя.

— Ведаеш, што гэта такое ў цябе праяўляецца? Няўклюдніцтва! — Коля кінуў вокам на нямыты посуд, крышыны на стале, шматкі паперы пад сталом і паказаў на тэлевізар: — А гэта што такое?

— Мая „Юнасць”, тэлевізар з электронным гадзіннікам ды тэлегазетай. Усё як трэба, каб адчуваць сябе як сучасны спажывец культуры і інфармацыі.

Вандал Арлянскі

Паветраны шантаж

Мядзведзь Сандар Жоржавіч на дзень да чарговага сходу ўселяснога кіраўніцтва вярнуўся з Уладзімірскага лесу з сустрэчы з ваўком Нятупіным. Не хацеў з ім бачыцца, ды трэба было, бо штосьці ўсё менш наплывала ў ягоны лес з Уладзімірскага чыстага паветра. Не хацеў, бо ўсё ў памяці лунала, як Нятупін абразіў яго, і то на вачысках усіх зямных лясоў ды пушч. „Трэба адагнаць Жоржавічавы мухі ад уладзімірскай падлы!” — усё прыгадваў мядзведзь воўкаву заяву. На думку аб ёй кожны раз хацелася ўздымацца на заднія лапы і выць ад злосці. Ды, на жаль, не дазваляла яму на гэта лясное жыццё. Чыстага паветра з Уладзімірскага лесу было ўсё менш і менш.

Цяпер, у час сустрэчы з Нятупіным сцяў іклы і выслухаў: „Атрымае, мядзведзь, ваш лес чыстае паветра без абмежаванняў, але ўзамен — усе вашы шышкі”.

Жоржавіч не мог таго сцярпець. Білася ў галаве: „А што нам застанецца?”

Воўк Нятупін быццам чуў ягоныя думкі:

— Застанецца вам чыстае паветра, — заявіў быў з воўчай усмешкай.

На гэта мядзведзь нічога не адказаў і вярнуўся дадому. А сустрэчу з уселясным кіраўніцтвам пачаў гэтак:

— Нятупін зноў падрывае нашу мядзведжую велічнасць. Наважыўся адносіцца да мяне, быццам да якога паразіта!

Лань Гаўрусіха абурылася:

— Былі ў мяне паразіты і ведаю, якія яны! Зусім яны да вас, мішка вы наш, непадобныя. Дурноты вярзе той Нятупін.

— Мілая ты, Гаўрусіха, але Нятупін гаварыў гэта, так сказаць, вобразна, каб было мацней, каб мне дапячы.

— Ну дык і вобраз! Хто ж увасабляе паразітаў! Вобразы павінны быць прыгожыя, а не, так сказаць, узятыя з-пад хваста! — скрывілася вавёрка Кацюша, адказваючая ў кіраўніцтве за эстэтыку ды культуру сярод лясное браціі.

— Маўчы, дурная рыжая кіта! — знерваваўся Жоржавіч. — Нятупін ужо здаўна спрабуе мяне абразіць, вывесці з нерваў, каб толькі зламаць мяне і за чыстае паветра забраць нам усе шышкі.

— Ды без шышак наша лясная брацыя як без лапы! — скалануўся барсук Барушчук.

— Ну вось, — патакнуў мядзведзь. — Дык што нам рабіць?

Найбліжэйшы ў кіраўнітцве мядзведзеў дарадчык дзяцел Стукач запрапанаваў:

— А, можа, мы самі пачнем вырабляць чыстае паветра?

— Гэта немагчыма. Не ўдасца перарабіць наша на чыстае, бо ж завельмі геапалітычна папсаванае яно, — прыпомніў Жоржавіч. — Выходзіць на тое, што прыйдзецца нам абысціся без шышак.

— Але... — спрабавала штосьці сказаць Гаўрысіха.

— Наша лясная брацыя ўмее абысціся без усяго. Абыдзецца і без шышак. Без чыстага паветра немагчыма жыць, і без шышак цяжка, як без лапы. Без адной лапы можна ж, аднак, неяк жыць, так ці не.

Як мядзведзь сказаў, так і загадаў. Толькі Стукач затрапятаў нервова крыламі, спрабуючы ўтрымаць раўнавагу на адной назе.

— Добра, прынамсі, што лётаць умею.

МакХолад

ISSN 0546-1960